www.gazeta.bsu.by

# УНІВЕРСІТЭТ

БДУ

Газета Беларускага дзяржаўнага універсітэта

16 лютага 2007 года, №№ 2-3 (1953-1954)

СУПРАЦОЎНІЦТВА

# КІТАЙСКІЯ ДАЛЯГЛЯДЫ

**На факультэце міжнародных адносін БДУ 26 студзеня адбылася прэзентацыя Рэспубліканскага інстытута кітаязнаўства імя Канфуцыя.**

Ва ўрачыстым мерапрыемстве прынялі ўдзел міністр адукацыі нашай краіны Аляксандр Радзькоў, намеснік міністра замежных спраў Беларусі Віктар Гайсёнак, Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол КНР у Рэспубліцы Беларусь У Хунбінь, рэктар БДУ прафесар Васіль Стражаў, а таксама прадстаўнікі Пекінскага універсітэта мовазнаўства і культуры — партнёра Белдзяржуніверсітэта ў гэтым праекце.

Інстытут імя Канфуцыя ўзнік у снежні 2006 г. на базе Рэспубліканскага цэнтра БДУ "Іерогліф". Створаны ён у адпаведнасці з пратаколам даручэнняў Прэзідэнта Беларусі Аляксандра Лукашэнкі па выніках візіту дзяржаўнай дэлегацыі нашай краіны ў Кітай і пагадненнем аб супрацоўніцтве паміж БДУ і Канцылярыяй КНР па распаўсюджанні кітайскай мовы за мяжой, падпісаным у Мінску летам 2006 г.

Рэспубліканскі інстытут імя Канфуцыя будзе займацца развіццём айчыннага кітаязнаўства на аснове апошніх навуковых дасягненняў у галіне інфармацыйных тэхналогій, павышэннем кваліфікацыі і перападрыхтоўкай спецыялістаў у галіне кітайскай мовы і кітайскай культуры, рэалізацыяй адукацыйных праграм у сферы вышэйшай і паслядыпломнай адукацыі, арганізацыяй курсаў і стажыровак па кітаязнаўстве і ўсходазнаўстве, навучаннем кітайскай мове. Акрамя таго, новы інстытут будзе спрыяць актывізацыі інфармацыйнага абмену паміж дзвюма краінамі ў сферы эканомікі і ўсталяванню кантактаў паміж прадпрыемствамі і фірмамі. У сувязі з гэтымі задачамі ў структуры інстытута створаны два цэнтры — лінгвакраіназнаўства, а таксама эканомікі і маркетынгу.




Фінансаванне мяркуецца з рэспубліканскага бюджэту і за кошт уласных даходаў і сродкаў, вылучаных у рамках пагаднення паміж Пекінскім універсітэтам мовазнаўства і культуры і БДУ. Урад КНР выдаў аднаразовую фінансавую дапамогу на перыяд станаўлення інстытута. Кітайскі бок накіруе сюды і двух выкладчыкаў. З часам плануецца пераход інстытута на самаакупнасць.

Дарэчы, інстытут імя Канфуцыя ў Мінску стаў трэцім на тэрыторыі СНД (пасля Пецярбурга і Ташкента). Самы ж першы інстытут імя Канфуцыя быў адкрыты ў Сеуле (Паўднёвая Карэя) у лістападзе 2004 г. Увогуле, на сёння ў 34-х краінах дзейнічаюць 80 такіх установ.

**Валянціна КЛЯНІЦКАЯ**

**Фота Сяргея СТРАЛКОЎСКАГА**

**СЁННЯ Ў НУМАРЫ:**

**НОВАЙ ЭКАНОМІЦЫ — НОВЫЯ ВЕДЫ**
Справаздача дэкана эканамічнага факультэта Міхаіла КАВАЛЁВА... **Стар. 2-3**

**ФОРУМ БЕЗ ГАЛЬШТУКАЎ**
Пра з'езд моладзі краін СНД у БДУ **Стар. 5**

**КАЛЕЙДАСКОП НАВІН**
Цікавая інфармацыя з галіны навукі і адукацыі **Стар. 8**

УШАНАВАННЕ

# ПЕРШЫ ГАНАРОВЫ ПРАФЕСАР БДУ

Генеральнаму дырэктару Сусветнай арганізацыі інтэлектуальнай уласнасці (Швейцарыя) Камілу Ідрысу нададзена званне "Ганаровы прафесар БДУ". Урачыстая цырымонія з гэтай нагоды адбылася 1 лютага ў зале пасяджэнняў Вучонага савета.

Гэтая працэдура прадугледжана ў новай рэдакцыі Статута Белдзяржуніверсітэта, зацверджанай у верасні 2006 г. Грамадзянін Судана Каміл Ідрыс стаў першай ушанаванай такім чынам асобай. Ён узначальвае Сусветную арганізацыю інтэлектуальнай уласнасці з 1997 г., з'яўляецца прафесарам права, доктарам міжнароднага права, бакалаўрам мастацтваў у галіне філасофіі, палітычных навук і міжнародных адносін, аўтарам кнігі "Інтэлектуальная ўласнасць — магутны інструмент эканамічнага росту" і сааўтарам кнігі "Нацыі, якія ўлічваюць пытанні інтэлектуальнай уласнасці, пракладваючы шлях ад тых, што развіваюцца, да развітых".

**Паводле інфармацыі прэс-службы БДУ**

**Фота Сяргея СТРАЛКОЎСКАГА**



ВІЗІТЫ

# ДЫЯЛОГ З ПАСЕ

Старшыня Парламенцкай Асамблеі Савета Еўропы (ПАСЕ) Рэнэ ван дэр Ліндэн падчас свайго візіту ў нашу краіну наведаў 19 студзеня Беларускі дзяржаўны універсітэт. Тут адбылася яго сустрэча з рэктарам прафесарам Васілём Стражавым, на якой абмяркоўваліся пытанні ўдзелу БДУ ў інтэграцыйных працэсах у еўрапейскай сістэме вышэйшай адукацыі. Акрамя таго, старшыня ПАСЕ выступіў перад беларускімі студэнтамі. Падчас дыялогу, які праходзіў на англійскай мове, былі закрануты самыя розныя аспекты палітычнай, адукацыйнай, эканамічнай і культурнай праблематыкі.



**Паводле інфармацыі прэс-службы БДУ**

**Фота БелТА**

СУСТРЭЧЫ

# АПЕРАТЫЎНЫЯ ПЫТАННІ

У Беларускім дзяржаўным універсітэце 8 лютага адбылася сустрэча студэнтаў з начальнікам ГУУС Мінгарвыканкама генерал-маёрам міліцыі Анатолем Куляшовым. На ёй абмяркоўваліся пытанні прафілактыкі правапарушэнняў у маладзёжным асяроддзі, а таксама аператыўная абстаноўка ў Мінску.

Усяго прысутнічала 180 студэнтаў з 6-ці факультэтаў БДУ.

Удзел у сустрэчы прынялі прарэктар па вучэбна-выхаваўчай рабоце і сацыяльных пытаннях Уладзімір Суворaў і начальнік упраўлення выхаваўчай работы з моладдзю Павел Скалабан.

**Паводле інфармацыі ўпраўлення выхаваўчай работы з моладдзю**

# ВЕСТКІ З РЭКТАРАТА

ПАШЫРАНАЕ пасяджэнне рэктарата адбылося 5 лютага на біялагічным факультэце БДУ. З дакладам на тэму "Аб выкарыстанні сучасных адукацыйных тэхналогій у навучальным працэсе на біялагічным факультэце" выступіў дэкан біяфака Уладзімір Лысак.

ДА ДНЯ беларускай навукі было прымеркавана ўрачыстае пасяджэнне Вучонага савета БДУ, якое прайшло 29 студзеня. З дакладам, прысвечаным развіццю і падтрымцы навуковых школ, а таксама падрыхтоўцы кадраў вышэйшай кваліфікацыі, выступіла начальнік Галоўнага ўпраўлення навукі БДУ доктар фізіка-матэматычных навук Таццяна Дзік.

ЧЛЕНЫ РЭКТАРАТА разам з дэканамі факультэтаў журналістыкі, філасофіі і сацыяльных навук, а таксама дырэктарам Інстытута бізнесу і менеджменту тэхналогій наведалі будоўлю на вул. Кальварыйскай, дзе ў наступным навучальным годзе размесціцца вышэйпералічаныя навучальныя структуры. Зараз на гэтым аб'екце вядуцца апрацоўчыя работы.

ПАВОДЛЕ ВЫНІКАЎ выбараў дэпутатаў Мінскага гарадскога савета дэпутатаў XXV склікання, якія адбыліся 14 студзеня, дэкан факультэта журналістыкі Сяргей Дубовік быў абраны дэпутатам па Ясенецкай выбарчай акрузе № 26 Маскоўскага раёна г. Мінска.

БДУ ЗАНЯЎ другое месца сярод ВНУ г. Мінска ў гарадскім аглядзе-конкурсе на лепшую арганізацыю ідэалагічнай работы ў 2006 г. Вынікі былі падведзены ў канцы студзеня ўпраўленнем ідэалагічнай работы Мінгарвыканкама.

**Паводле інфармацыі прэс-службы БДУ**

З ПЕРШЫХ КРЫНІЦ

# НОВАЙ ЭКАНОМІЦЫ – НОВЫЯ ВЕДЫ

## Справаздача дэкана эканамічнага факультэта Міхаіла КАВАЛЁВА аб выкананні праграм перспектыўнага развіцця

Канцэпцыя факультэцкай Праграмы перспектыўнага развіцця закладзена ў словах: “Новай эканоміцы — новы змест, новыя формы, новыя тэхналогіі адукацыі”. Першы наш прыярытэт — новы змест — выцякае са спецыфікі развіцця эканамічнай навукі ў Беларусі: у СССР выкладалася марксісцкая палітэканомія. Пасля пачатку рэформ усім выкладчыкам неабходна было ў сціслыя тэрміны асвоіць цэлы шэраг новых дысцыплін: макра-, мікра- і міжнародную эканоміку. Пры гэтым, калі ў першыя гады курсы чыталіся паводле перакладзеных падручнікаў, то сёння амаль па ўсіх прадметах існуюць арыгінальныя дапаможнікі, заснаваныя на сучаснай эканамічнай тэорыі і практыцы беларускай мадэлі эканамічнага развіцця.

Новыя формы — гэта новыя навучальныя планы і стандарты двухступеньчатай падрыхтоўкі. Разам з БДЭУ было распрацавана 4 стандарты новага пакалення, якія плануецца ўвесці ў навучальны працэс з наступнага года. Іх вызначальная рыса — змяншэнне колькасці дысцыплін-модуляў да 50-ці і канцэнтрыраванае выкладанне модуля ў адзін семестр, што рэзка знізіць колькасць прамежкавых экзаменаў і залікаў і дазволіць студэнтам засяродзіць сваю ўвагу на невялікай колькасці дысцыплін на працягу аднаго семестра.

Яшчэ адзін наш прыярытэт — стаць паўнацэнным факультэтам, г.зн. давесці колькасць студэнтаў і магістрантаў да 1,5 тыс. за кошт пазабюджэтных студэнтаў. Высокую дынаміку росту навучэнцаў забяспечылі платныя студэнты (асабліва тыя, хто атрымлівае другую вышэйшую адукацыю) і магістранты (гл. граф. 1, 2). Нам удалося таксама давесці колькасць замежных студэнтаў да 83-х і магістрантаў — да 30-ці. На факультэце рэзка павялічылася лічба замежных аспірантаў — сёння іх 15 (Кітай, арабскія краіны, Нігерыя, краіны СНД).

**Праграма пашырэння платных адукацыйных па-слуг** фактычна выканана датэрмінова, і да атрымання ўласнага будынка план прыёму платных студэнтаў пашырацца не будзе. У цяперашні час на аднаго студэнта факультэта прыпадае толькі 0,7м² навучальнай плошчы.

Увогуле за апошнія 6 гадоў колькасць студэнтаў павялічылася ў 3 разы (гл. граф. 3). Забяспечваць навучальны працэс у такіх ускладненых умовах удаецца толькі з дапамогай рацыянальнай арганізацыі працы: уніфікацыя навучальных планаў, адна плынь на I—III курсах (160—180 студэнтаў), вялікія акадэмічныя групы. Факультэт перайшоў на еўрапейскую прадукцыйнасць працы — 15 студэнтаў на аднаго выкладчыка. Адзіная просьба да рэктарата — радыёфікаваць і аснасціць мультымедыйным праектарам лекцыйную аўдыторыю на 180 чалавек.

Графік 1




Мэты праграмы **“Кадры БДУ”** вызначаюцца зыходзячы з неабходнасці амаладжэння і забеспячэння кадрамі вышэйшай кваліфікацыі. Сёння на эканамічным факультэце працуе 59 штатных выкладчыкаў: 8 з іх (13,6 %) — дактары навук (у сярэднім па Міністэрству адукацыі — 56 %, БДУ — 11 %), 25 (42,4 %) — кандыдатаў навук (Міністэрства адукацыі — 36,2 %, БДУ — 47 %). Доля выкладчыкаў з навуковай ступенню — 56 % (Міністэрства адукацыі — 42 %, БДУ — 58 %). Іх сярэдні ўзрост — 44 гады. Наш факультэт даволі малады, але вышай за сярэднія для БДУ паказчыкі. Галоўнай праблемай з’яўляецца цякучасць кадраў сярод выкладчыкаў: за 8 гадоў сышлі 22 чалавекі, з іх 20 — кандыдаты навук. Найбольш пацярпела кафедра эканамічнай тэорыі: з яе сышлі 10 выкладчыкаў. Многія з іх знаходзяцца на дзяржслужбе, працуюць у камерцыйных ВНУ Беларусі і за мяжой: ва універсітэтах ЗША, Германіі, Галандыі, Італіі. Гэта сведчыць пра высокую кваліфікацыю нашых выкладчыкаў і дазваляе сёння пазычаць замежны досвед. Многія здольныя выпускнікі, магістранты, аспіранты таксама сыходзяць з універсітэта ў бізнес, у банкі — такі лёс усіх эканамічных факультэтаў свету. Нават тых, дзе заробкі істотна больш высокія, чым у нас.

Можна лічыць дасягненнем, што ў такіх цяжкіх умовах нашаму факультэту ўдалося захаваць асноўны касцяк навукоўцаў — каля 30-ці старшых выкладчыкаў, дацэнтаў і прафесараў узроставай групы ад 40 да 60-ці гадоў. Загадчыкі кафедр не мяняліся 8 гадоў: сёння ўсе яны дактары навук. Акрамя таго, на факультэце працуюць яшчэ 3 дактары навук, якія змогуць у будучым узначаліць тры новыя кафедры. Сталі вяртацца і тыя, хто сышоў у камерцыйныя ВНУ, часам — нават тыя, хто з’ехаў калісьці за мяжу.

*Некалькі слоў пра вядучых навукоўцаў.*

Кафедру тэарэтычнай эканомікі ўзначальвае вядомы беларускі эканаміст, прафесар У.Л.Клюня.

Доктар навук П.С.Лямешчанка — загадчык кафедры тэарэтычнай і інстытуцыянальнай эканомікі, буйны спецыяліст у галіне інстытуцыянальнай эканомікі, забяспечвае супрацоўніцтва з Цэнтрам грамадскіх навук МДУ. Два яго вучні — Ю.Валевіч і Н.Мельнікава — вядучыя маладыя дацэнты на факультэце.

Прафесар У.І.Тарасаў — загадчык кафедры банкаўскай і фінансавай эканомікі, вядомы беларускі эканаміст. Раней быў намеснікам дырэктара Інстытута эканомікі Акадэміі навук, дарадцай старшыні Нацбанка. Многія кіраўнікі банкаў — яго вучні. За чатыры апошнія гады кафедра падрыхтавала навучальныя дапаможнікі па найважнейшых курсах. Напрыклад, апошні падручнік “Карпатыўныя фінансы” не мае аналагаў у СНД.

Загадчык кафедры менеджменту прафесар Б.М.Паньшын сваёй навуковай кар’ерай абавязаны Кіеўскаму інстытуту імя Глушкова. Пазней ён адказваў за інфарматызацыю ў апараце СНД, стварыў кафедру і навуковы напрамак па электронным гандлі. Працы яго калектыву вядомыя не толькі ў нашай краіне, але і ў Еўропе. У мінулым годзе створана і актыўна працуе СНДЛ “Электронны гандаль”.

Прафесар У.Ф.Байнёў абараніў доктарскую дысертацыю, працуючы ў БДУ. Ён жа напісаў серыю навучальных дапаможнікаў па антыкрызісным кіраванні, рэгіянальнай эканоміцы, эканоміцы прадпрыемства. Прафесар Л.Я.Ціханава абараніла доктарскую дысертацыю ў 2003 г., падрыхтавала навучальныя дапаможнікі па рынку працы, дэмаграфічнай бяспецы. Прафесар С.А.Сударыкаў узначаліў новы напрамак — эканоміка інавацый.

На кафедры эканамічнай інфарматыкі і матэматычнай эканоміцы працуюць чатыры дактары навук. Іх працы добра вядомыя за мяжой. Дзякуючы ім на базе кафедры ў мінулым годзе прайшоў 18-ы Еўразійскі кангрэс па лагістыцы і індустрыяльнай эканоміцы.

Выкананне праграмы **“Навука”** прадугледжвае павелічэнне колькасці публікацый, пашырэнне ўдзелу ў дзяржпраграмах, у тым ліку фінансаваных. У БДУ на 20 чалавек з ліку прафесарска-выкладчыцкага саставу і навуковых супрацоўнікаў прыпадае адна манаграфія, на ЭФ за апошнія 4 гады гэты паказчык удвая вышэйшы — адна праца на 10 чалавек. Аб’ём фінансаваных НДР па факультэце адпавядае эквіваленту 2000 долараў на штатнага выкладчыка, што пакуль ніжэй, чым па ўсім універсітэце — 3000 долараў. Справа ў тым, што вядучыя навукоўцы з’яўляюцца кансультантамі ў многіх міністэрствах, банках, аўдытарскіх кампаніях і ў іх не застаецца часу весці яшчэ і гаспадарчыя дагаворныя тэмы, паколькі неабходна пастаянна ўдзельнічаць у разнастайных эканамічных групах па бягучай эканамічнай палітыцы, пісаць высновы па розных дакументах і г. д.

У нас мацнее паўная дасягненні ў ***навукова-даследчай рабоце студэнтаў***. Каманда факультэта ў складзе Т.Кузьмініча, А.Гусева і А.Анейчыка заняла III месца (з 2220-ці камандаў) на віртуальнай біржы Каліфарнійскага універсітэта. Студэнт В.Ждановіч у складзе зборнай Беларусі заняў I месца (з 1165-ці камандаў) у Сан-Дыега на фінальных спаборніцтвах па менеджменце і мадэляванні эканомікі. Студэнты А.Шашко і А.Гусеў занялі I месца ў спаборніцтвах па МЭМ сярод краін СНД, прысвечаных юбілею Санкт-Пецярбурга. Магістрант А.Шашко апублікаваў 16 навуковых прац і 2 гады запар з’яўляецца стыпендыятам Фонду Прэзідэнта.

Графік 2




Разам з тым у навуковай рабоце студэнтаў існуюць пэўныя праблемы. Паводле апытанняў, трэціна ўсіх студэнтаў паралельна працуе на фірмах, а на старэйшых курсах — практычна ўсе. Таму па статыстыцы НДРС на нашым факультэце ніжэй за сярэднеуніверсітэцкі ўзровень. Пытанне ўзмацнення НДРС асабіста ўзята пад кантроль самім дэканам. Станоўчы момант бачыцца ў тым, што вялікая колькасць студэнтаў-эканамістаў публікуе артыкулы праз арганізаваныя на факультэце карпункты “Вестника ассоциации белорусских банков”, часопісаў “Финансы”, “Банкаўскі веснік”.

Дарэчы, на гэтую пяцігодку ў рамках ДПФД “Эканоміка і грамадства” факультэт вырашае два важныя заданні. Першае мае назву “Распрацоўка і ўкараненне рэйтынгавых метадаў даследавання эканамічнага стану, інавацыйнага патэнцыялу і інвестыцыйнага клімату рэгіёнаў, гарадоў, буйных прадпрыемстваў, банкаў з мэтай прагназавання іх устойлівага развіцця” і выклікае значную цікавасць сярод грамадскасці. Рэйтынгі (гатоўнасць да канкурэнцыі) рыхтуе і публікуе рэйтынгавае агенцтва факультэта, дзе працуюць студэнты, якія займаюцца рэйтынгамі банкаў, універсітэтаў, рэгіёнаў і нават рэстаранаў. Другое заданне — падрыхтоўка прапаноў па інавацыйнай мадэлі развіцця беларускай эканомікі.

Наступная праграма — **“Выдавецкая дзейнасць”** — рэалізуецца факультэтам у поўнай ступені. У БДУ выдаецца ў год прыкладна 500 навучальных дапаможнікаў на 1000 навуковых супрацоўнікаў, якія маюць вучоную ступень. Кожны з іх  у сярэднім за 2 гады выдае адзін дапаможнік. За 4 гады на факультэце выйшла 18 манаграфій і 52 навучальныя дапаможнікі, што складае

Графік 3




* ПВС – прафесарска-выкладчыцкі састаў;
** ВДП – вучэбна-дапаможны персанал

прыкладна 70 кніг на 30 штатных выкладчыкаў з вучонай ступенню. Гэты паказчык вышэй, чым па ўсім БДУ. Дзякуем упраўленню рэдакцыйна-выдавецкай дзейнасці, якое стала працаваць больш аператыўна. Наладзілася пытанне, звязанае з размеркаваннем тыражу. Спадзяемся і на больш прадуктыўнае супрацоўніцтва з Выдавецкім цэнтрам БДУ. У сувязі з гэтым прапануем у тэмплан БДУ ўключаць тыя навучальныя дапаможнікі, якія маюць грыф, хаця б ВМА, і толькі з тыражамі не менш за 1000 экзэмпляраў. Астатнія навучальныя дапаможнікі і вучэбна-метадычныя комплексы выдаваць у электронным выглядзе і па спрошчанай схеме на ксераксах ці рызографах.

Удзел эканамічнага факультэта ў праекце TEMPUS разам з ВНУ Германіі, Італіі, Іспаніі дазволіў значна прасунуцца ў выкананні праграмы **"Увядзенне ў адукацыйны працэс крэдытна-модульнай сістэмы"**. Навучальныя планы і навучальныя праграмы абсалютна ўсіх спецыяльнасцей і курсаў пераведзены ў еўрапейскі стандарт і падрыхтаваны да выдання на рускай і англійскай мовах. Гэта, па-першае, паглыбіла змест курсаў да сусветна-еўрапейскага узроўню; па-другое, дазволіла вызначыць адпаведнасці гадзін і крэдытаў па кожным модулі; па-трэцяе, ужо дапамагло студэнтам, якія выязджаюць навучацца за мяжу, — цяпер там прызнаюцца ўсе здадзеныя ў нас прадметы; па-чацвёртае, усе матэрыялы змяшчаюцца на сайце і паказваюць узровень факультэта ў англамоўным сектары Інтэрнэту.

Адбыліся зрухі і ва уніфікацыі нашых адзнак з еўрапейскай сістэмай (гл. граф. 4). Пасля кожнай сесіі аналізуюцца вынікі ў параўнанні з міжнароднымі стандартамі: прыкладна траціна выдатных, траціна здавальняючых і траціна добрых адзнак. У Беларусі тры адзнакі — 6, 7, 8 — даюць "добра", іх звычайна атрымліваюць 2/3 студэнтаў. Выдатных адзнак выкладчыкі выстаўляюць мала. Паводле выканання праграмы "Увядзенне ў адукацыйны працэс крэдытна-модульнай сістэмы" ў БДУ эканамфак з'яўляецца адным з лідэраў і гатовы падзяліцца сваім досведам.

У праграме **"Абітурыент"** лозунг нашага факультэта — "Мы разумных робім багатымі, а багатых — разумнымі". Дзякуючы рэкламнай кампаніі і прарастасці прахаднога бала пры здачы дакументаў на бюджэтнае аддзяленне былі залічаны абітурыенты з балам 313 і вышэй, усе астатнія аддалі перавагу платнаму навучанню і не пайшлі ў іншыя ВНУ, хаця з балам 300—312 яны б лёгка знайшлі бюджэтныя месцы па іншых факультэтах БДУ.

Мяркую, што з выкананнем гэтай праграмы праблем не будзе. Яе галоўны элемент — высокі імідж факультэта ў грамадстве. Нас задавальняюць тэставыя экзамены. Аналіз паказвае, што вынікі здачы тэстаў абітурыентамі адпавядаюць іх узроўню навучання на факультэце.

Пяройдзем да самага складанага — інавацыйнай праграмы **"Сучаснае арганізацыйнае забеспячэнне і кантроль якасці самастойнай работы"** (КСР на эканамфаку БДУ пакуль што займае 20 % вучэбнага часу, на эканамфаку МДУ — 50 %). Нашы прыярытэты ў КСР — тэсты, Інтэрнэт-навучанне (95 % студэнтаў ЭФ маюць хатні выхад у Інтэрнэт), сістэма e-University. Экзаменацыйныя тэсты з першых дзён існавання факультэта — наша галоўнае дасягненне.

Web-сайт факультэта — гэта галоўны інструмент для кантакту са студэнтамі. Ён стварае імідж факультэта ў Інтэрнэт-прасторы, інфармуе абітурыентаў, прадстаўляе студэнтам адкрытыя вучэбныя матэрыялы (план, праграмы прадметаў і практык, узоры дыпломных і магістэрскіх работ, электронныя навучальныя дапаможнікі), дэманструе ўзровень навуковай работы (публікацыі, дысертацыі, навуковыя справаздачы, анонсы і матэрыялы канферэнцый), дае магчымасць студэнтам знаходзіць карысныя Інтэрнэт-рэсурсы (акно ў глабальную адукацыйную прастору) кшталту віртуальных бібліятэк і энцыклапедый, часопісаў, бібліяграфій, карпаратыўных сетак, дапамагае ў пошуку працы, падтрымлівае сувязь з выпускнікамі, паведамляе пра грамадска-культурнае і спартыўнае жыццё факультэта.

*Нашы прапановы*: у газеце "Універсітэт" публікаваць рэйтынг сайтаў факультэтаў. Вэбаметрыя (рэйтынг сайтаў 10 тыс. універсітэтаў) сёння вельмі папулярная: на 1-м месцы стаіць Каліфарнійскі універсітэт, на 2-м — Гарвардскі. МДУ займае 322-е месца, БДУ знаходзіцца на 2403-м, Гродзенскі універсітэт — на 4376-м. Галоўныя крытэрыі ў замежнай вебаметрыі — бачнасць сайта, памер (уключаючы файлы спецыяльных фарматаў — pdf, ppt, doc). Паводле гэтых крытэрыяў у БДУ лідзіруе Дзяржаўны інстытут кіравання і сацыяльных тэхналогій, за ім — юрфак, біяфак і эканамфак.

Наступны прыярытэт — выкарыстанне сістэмы e-University. У медыятэках павінны праходзіць лабараторныя пад кантролем выкладчыкаў, тэсціраванне, лекцыі паводле прынцыпу "рабі, як я", навучанне пошуку Інтэрнэт-рэсурсаў і самае галоўнае — медыятэкі павінны стаць цэнтрамі атрымання прафесійных сертыфікатаў на платнай аснове кшталту TOEFL, GRE, CMAT, Microsoft.

Сістэма e-Uni ідэальна падыходзіць для правядзення экзаменацыйных тэстаў (асабліва для завочнага аддзялення), тэставага КСР, захавання інфармацыйных матэрыялаў для студэнтаў (працоўны план курса, расклад заняткаў, заданні для самастойнай работы, тыпавыя пытанні і адказы, прэзентацыі).

*Нашы прапановы*: распрацаваць больш дэталёвы электронны макет працоўнага плана і захоўваць яго ў e-Uni; адэкватна росту загрузкі нарошчваць магутнасці гэтай сістэмы і Інтэрнэт-доступу да яе; у прыярытэтным парадку ствараць агульнауніверсітэцкія ВМК, электронныя падручнікі па сацыяльна-гуманітарным і прыродазнаўчым навуковым блоку — адзіным для ўсяго БДУ.

З ліку новых прыярытэтаў — Інтэрнэт-кааперацыя навукоўцаў ці выкладчыкаў адной дысцыпліны па навуковых інтарэсах, стварэнне намаганнямі прафесараў з некалькіх ВНУ агульных сайтаў. Такое супрацоўніцтва будзе эфектыўным, напрыклад, з эканамічнымі факультэтамі іншых беларускіх ВНУ, калегамі з краін СНД. Акрамя дапамогі абласным ВНУ ў выглядзе мэтавай аспірантуры (штогод на эканамфаку БДУ навучаюцца больш за 10 чалавек) і ўдзелу ў ДЭКах, мы спрабуем наладзіць унутрынацыянальную мабільнасць студэнтаў, што дае магчымасць паспяхова выконваць праграму **"Кааперацыя"**.

На факультэце не забываюцца і старыя напрацаваныя тэхналогіі. Найперш — ідэя Гумбальта: "Без адукацыі няма навукі, без навукі няма адукацыі". Яна рэалізуецца праз удзел студэнтаў пад кіраўніцтвам прафесараў у рэальных навуковых праектах кшталту "Будучая эканоміка беларускай энергетыкі", інавацыйных рэйтынгі, электронны гандаль.

Па-другое, праводзяцца творчыя дыскусійныя семінары, дзе будучых эканамістаў вучаць спрачацца, адстойваць свой пункт погляду. Студэнтам вельмі падабаецца пісаць аналітычныя запіскі на тэмы: "Калі б я быў дарадцай міністра фінансаў (эканомікі), старшыні Нацбанка...".

Сістэма матывацый выкладчыкаў у выглядзе надбавак і прэмій пазычана з эканамічнага факультэта МДУ (калі нагрузка большая за 200 гадзін (аўд.+КСР), то заробак адэкватна павялічваецца) і знаходзіцца ў прамой залежнасці ад 3-х фактараў: аўдыторная нагрузка, укараненне новых тэхналогій, рэйтынг сярод студэнтаў.

Графік 4




Студэнцкая камісія, якая назірае за якасцю адукацыі, рэгулярна забяспечвае факультэт рэйтынгамі выкладчыкаў. Нашы студэнты падтрымліваць сайт накшталт нямецкага Mein Professoren, дзе яны выказваюць сваё меркаванне наконт выкладання і здачы іспытаў.

У рамках выканання праграмы **"Рэфармаванне дзвюхступеньчатай сістэмы і развіцця магістратуры"** эканамічны факультэт першым у БДУ стварыў паўнацэнную двухгадовую магістратуру (вочную і завочную). З 2002 г. падрыхтавана 320 магістраў. Магістратура карыстаецца высокай папулярнасцю сярод рэальнага сектара эканомікі і банкаў. Праблемы ўзніклі з увядзеннем навукова-педагагічнай магістратуры. Мы перакананыя, што практыкаарыентаваная магістратура будзе аднаўлена, і не толькі для замежнікаў. Мноства прыкладных дысертацый (напрыклад, "Бюджэт гандлёвага прадпрыемства") можа і павінна быць заменена магістэрскай дысертацыяй. Практыкаарыентаваная магістратура сёння запатрабаваная на стыках навук і разглядаецца як альтэрнатыва курсам па перападрыхтоўцы і павышэнню кваліфікацыі.

Галоўны вынік працы любога факультэта — паспяховасць студэнтаў. Увядзенне і ўлік прамежкавых адзнак (іх колькасць па большасці прадметаў — ад 4-х да 6-ці) крыху знізіла выніковы бал, але прымусіла студэнтаў больш глыбока засвойваць прадмет. Выпадковыя выдатныя адзнакі выключаюцца. Толькі поўная адпрацоўка курса дае станоўчую адзнаку. Акрамя таго, на павышэнне паспяховасці студэнтаў (з улікам долі 10-ці % замежных студэнтаў з сярэдняй адзнакай "пяць") паўплывалі больш жорсткія патрабаванні да экзаменацыйных тэстаў, якія сёння адпавядаюць сусветным стандартам эканамічнай адукацыі. Крыху знізіліся адзнакі выніковых экзаменаў, што тлумачыцца адыходам штогод у магістратуру пасля 4-х гадоў навучання прыкладна 40 лепшых студэнтаў.

Найважнейшая ацэнка нашай працы — размеркаванне. За ўсе гады існавання факультэта ў аддзелах занятасці не зарэгістраваны ніводзін выпускнік. Свабоднае працаўладкаванне атрымалі альбо выпускнікі, якія працуюць у Мінску, але не маюць мінскай прапіскі (ад немінскіх арганізацый паступае вельмі абмежаваная колькасць заявак), альбо выпускнікі з фармуліроўкай: "Возьмем на працу пры ўмове свабоднага ўладкавання". Сёлета ўсе студэнты будуць размеркаваныя. У міністэрствы, ведамствы, на прадпрыемствы ўжо разасланы апісанні кожнай спецыяльнасці, прыведзена колькасць студэнтаў для размеркавання і сціслыя рэзюме на кожнага з іх. Пачалі прыходзіць заяўкі. Асаблівая ўвага надаецца іншагароднім студэнтам.

У заключэнні прыводзім вытрымкі з высноў некаторых атэстацый факультэта:

"Дэканат і Савет факультэта ў поўнай меры каардынуюць, накіроўваюць і кантралююць работу кафедраў па дасягненні галоўнай мэты — забеспячэнне высокай якасці навучання" — з высновы Камісіі па атэстацыі БДУ ў 2003 г.;

"...Эканамічны факультэт актыўна абнаўляе навучальны працэс і ўкараняе прагрэсіўныя формы кантролю ведаў" — з высновы Камісіі Міністэрства адукацыі аб выніках праверкі у 2006 г.

"...Структура навучальнага плана і змест курсаў адпавядае еўрапейскаму ўзроўню і сучасным тэндэнцыям. Не выклікае сумнення, што на факультэце працуе каманда сапраўдных прафесіяналаў" — з высновы прафесара К.Рыхтэра (Франкфурт) і прафесара Э.Таўфера (Трэнта) у рамках праекта TEMPUS у 2006 г.

# АБ ВЫНІКАХ ПРАВЕРКІ РАЗВІЦЦЯ ЭКАНАМІЧНАГА ФАКУЛЬТЭТА Ў 2004–2006 гг.

## Даклад начальніка Галоўнага упраўлення вучэбнай і навукова-метадычнай работы Людмілы Хухлындзінай

Для праверкі эканамічнага факультэта загадам рэктара была створана камісія ў наступным складзе: прарэктар па вучэбнай рабоце У.Л. Клюня (старшыня), начальнік ГУ ВНМР Л.М. Хухлындзіна (намеснік старшыні), дырэктар ДУА "ІБМТ" БДУ У.У. Апанасовіч, дырэктар ЦІТ Ю.І. Варатніцкі, начальнік УК А.Д. Клімковіч, начальнік УПКВК К.М. Каросцік, начальнік НДЧ У.В. Панарадаў, дэкан геафака І.І. Пірожнік, дэкан гістфака С.М. Ходзін. Акрамя таго, у праверцы факультэта былі задзейнічаны спецыялісты Галоўнага ўпраўлення вучэбнай і навукова-метадычнай работы. Перш за ўсё камісія адзначыла, што на факультэце зроблена вялікая работа па выкананні праграм перспектыўнага развіцця БДУ. Факультэт ажыццяўляе падрыхтоўку кадраў па чатырох спецыяльнасцях: "Фінансы і крэдыт", "Менеджмент", "Эканоміка", "Эканамічная тэорыя". У вучэбных планах і праграмах улічваюцца сучасныя патрэбы сацыяльна-эканамічнага развіцця краіны.

*Дыяграма 1*







На пяці кафедрах факультэта працуюць 114 выкладчыкаў, з якіх 59 чалавек на пастаяннай аснове, 55 — на ўмовах унутранага і знешняга сумяшчальніцтва. Сярод штатных супрацоўнікаў 5 дактароў навук і 25 кандыдатаў навук (50,8 %). Да выкладання спецыяльных дысцыплін прыцягваюцца вядучыя спецыялісты з дзяржаўных органаў, фінансавых і банкаўскіх структур, розных ВНУ краіны. Разам з тым колькасць выкладчыкаў, якія працуюць на пастаяннай аснове, зменшылася на 19,2 % у параўнанні з 2004 г. Нявялікі працэнт штатных выкладчыкаў (40 %) адзначаны на кафедры банкаўскай і фінансавай эканомікі. Суадносіны штатных супрацоўнікаў і сумяшчальнікаў факультэта падаецца ў дыяграме 1.

Адна з найбольш сур'ёзных праблем, з якімі сутыкаецца факультэт, — гэта забеспячэнне аўдыторным фондам. Ва ўмовах павелічэння прыёму студэнтаў, асабліва на платную форму навучання, рэзка паўстала пытанне пра навучальныя плошчы. Факультэт мае толькі 3 паточныя аўдыторыі і 4 аўдыторыі для правядзення практычных і семінарскіх заняткаў. У выніку, заняткі адбываюцца ў тры змены. Такое становішча прымушае надаць асаблівую ўвагу арганізацыі самастойнай работы студэнтаў. На факультэце шырока выкарыстоўваюцца стратэгіі актыўнага навучання, якія адпавядаюць сучасным патрабаванням.

*Табліца 1*

| Год | Абсалютная паспяховасць (у %) | Тыя, хто здаў сесію на "выдатна" (у %) | Тыя, хто мае нездавальняючыя адзнакі (у %) |
|---|---|---|---|
| 2003 | 72 | 15,9 | 16,6 |
| 2004 | 90 | 17,6 | 6,2 |
| 2005 | 89 | 11,5 | 9,6 |
| 2006 | 81 | 3,2 | 17,8 |

У выкладанні асноўных дысцыплін прафесійнай падрыхтоўкі ўкараняецца рэйтынгавая сістэма ацэнкі ведаў. Аднак аналіз паспяховасці паказвае, што колькасць студэнтаў, якія паспяваюць на "выдатна", змяншаецца, а колькасць тых, хто атрымлівае нездавальняючыя адзнакі, расце (гл. табліцу 1). Гэта тлумачыцца не столькі ростам патрабавальнасці выкладчыкаў, колькі недастатковай базавай падрыхтоўкай студэнтаў платнай формы навучання. Акрамя таго, сярод непаспяваючых — вялікая доля замежных студэнтаў, якія, слаба валодаюць мовай (асабліва на малодшых курсах) і маюць вялікія складанасці ў адаптацыі да нашай сістэмы адукацыі.

Гэтая тэндэнцыя яскрава прасочваецца на завочным аддзяленні, дзе абсалютная паспяховасць упала з 96 % у 2003 г. да 51,2 % у 2006 г. (паводле вынікаў летніх сесій).

Праведзеныя кантрольныя зрэзы на II і III курсах прадэманстравалі ў цэлым дастатковы ўзровень астаткавых ведаў студэнтаў па вышэйшай матэматыцы, мікраэканоміцы і міжнароднай эканоміцы.

Добра зарэкамендавала сябе арганізацыя выніковай атэстацыі выпускнікоў — комплексныя тэставы экзамен, які дазваляе ацаніць якасць падрыхтоўкі па спецыяльнасці. Дыпломныя работы маюць высокую ступень практычнай накіраванасці. Кафедры практыкуюць публікацыю навуковых артыкулаў (у саўтарстве "дыпломнік—кіраўнік") паводле дасягнутых вынікаў даследавання.

У навучальны працэс актыўна ўкараняюцца камп'ютарныя тэхналогіі. Факультэт вядзе работу па бесперапынным вывучэнні інфармацыйных тэхналогій на працягу ўсяго перыяду навучання, не абмяжоўваючыся базавымі курсамі па іх асновах.

Асабліва высокі ўзровень падрыхтоўкі студэнтаў у галіне выкарыстання інфармацыйных тэхналогій і праграмных сродкаў адзначаны на спецыяльнасцях "Менеджмент" і "Эканоміка". Ускосным доказам гэтага служыць большасць курсавых, дыпломных, бакалаўрскіх і магістэрскіх работ, пры напісанні якіх выкарыстаны найважнейшыя сродкі MS Office (Excel, Access, PowerPoint, праграмы на VBA), змешчана вялікая колькасць дастаткова складаных графікаў і дыяграм. Дадаткі да работ сведчаць пра ўменне студэнтаў працаваць з базамі даных Сусветнага банка і МВФ, электроннымі табліцамі. Прыкладзеныя да работ прэзентацыі сведчаць пра высокі ўзровень валодання студэнтамі сродкамі MS PowerPoint. Працэнт бакалаўрскіх і дыпломных работ, выкананых у 2005—2006 навучальным годзе з выкарыстаннем матэматычных метадаў і ЭВМ (у разрэзе кафедраў), паказаны ў табліцы 2.

Для арганізацыі вучэбна-метадычнага забеспячэння самастойнай работы студэнтаў зроблена вялікая работа па стварэнні інфармацыйных рэсурсаў, даступных на сайце факультэта. Створана электронная бібліятэка, якая ўключае на цяперашні момант 70 навучальных дапаможнікаў аб'ёмам больш за 15 000 старонак. Забяспечаны доступ студэнтаў да статыстычных баз даных, якія штогод абнаўляюцца.

Разам з тым, адзначаецца нераўнамернае забеспячэнне вучэбна-метадычнымі дапаможнікамі па спецыяльнасцях факультэта. Адсутнічаюць электронныя адукацыйныя рэсурсы па дысцыплінах агульнауніверсітэцкіх кафедраў і кафедраў іншых факультэтаў.

*Табліца 2*

### Выкарыстанне ў дыпломных работах прафесійных праграмных сродкаў

| Назва кафедры | Спецыяльнасць | Доля выкарыстання |
|---|---|---|
| Эканамічная інфарматыка і матэматычная эканоміка | Эканоміка | 100% |
| Менеджмент | Менеджмент | 90% |
| Банкаўская і фінансавая эканоміка | Фінансы і крэдыт | 50% |
| Тэарэтычная і інстытуцыянальная эканоміка | Эканамічная тэорыя | 20% |

*Дыяграма 2*




Застаецца высокім працэнт выпускнікоў, якія атрымалі свабоднае працаўладкаванне ў сувязі з адсутнасцю месцаў для размеркавання: 2004 г. — 27,6 %, 2005 г. — 34,1 %, 2006 г. — 11,8 %.

Навукова-даследчая работа праводзіцца па 5-ці асноўных напрамках. Агульная колькасць навуковых публікацый за 2003—2006 гг. — больш за 500, у тым ліку 18 манаграфій, 52 навучальныя дапаможнікі, 5 зборнікаў навуковых прац. У перыяд з 2001 г. па 2006 г. эканамічны факультэт удзельнічаў у выкананні 9-ці заданняў дзяржаўных, навукова-тэхнічных і фундаментальных праграм, а таксама выканаў 16 НДДКР для розных заказчыкаў у рамках бюджэтных і гаспадарчых дагавораў. Разам з тым назіраецца відавочная перавага кафедры менеджменту ў галіне прыцягнення фінансавання і недастатковая альбо поўная адсутнасць фінансаваных НДДКР на іншых кафедрах.

Яшчэ адна праблема, на якую павінен звярнуць увагу факультэт, — гэта арганізацыя студэнцкай навуковай работы. Практычна ўсе колькасныя паказчыкі НДРС на эканамічным факультэце ніжэй, чым у сярэднім па БДУ. Між тым, у БДУ і ў цэлым па краіне створаны ўмовы для рэалізацыі навуковай актыўнасці студэнтаў эканамічнага напрамку. Напрыклад, Рэспубліканскі конкурс навуковых прац студэнтаў, дзве секцыі якога створаны і працуюць на базе БДЭУ. Прывядзем поўную статыстыку падачы прац на гэтыя дзве секцыі ў 2006 г.: ПУА "Мінскі інстытут кіравання" — 106, Полацкі дзяржаўны універсітэт — 37, БНТУ — 61, Баранавіцкі дзяржаўны універсітэт — 16, БДУ — 20 (значная частка прац пададзена студэнтамі факультэта міжнародных адносін — 13, студэнтамі эканамічнага факультэта — 7).

У БДУ выдаецца электронны зборнік прац навуковай канферэнцыі студэнтаў і аспірантаў. Публікацыі з гэтага зборніка "залічваюцца" пры паступленні ў аспірантуру БДУ, удзельнічаюць у рэспубліканскім конкурсе навуковых прац, конкурсе навуковых прац студэнтаў БДУ, конкурсе грантаў і г. д. Між тым, колькасць навуковых публікацый студэнтаў эканамічнага факультэта ў зборніку прац навуковай канферэнцыі студэнтаў і аспірантаў у асобныя гады была істотна ніжэйшай за вызначаныя квоты.

Тры разы за апошнія 5 гадоў студэнты эканамічнага факультэта не ўдзельнічалі ў конкурсе на лепшую работу студэнтаў БДУ ў галіне сацыяльных і гуманітарных навук.

Нізкая актыўнасць НДРС, адсутнасць дакладнай сістэмы арганізацыі і інфармацыйнага забеспячэння студэнтаў і ПВС у галіне НДРС на самім факультэце прыводзіць да таго, што тыя, хто паступае ў аспірантуру, маюць слабы навуковы зачын і, як вынік, не паспяваюць закончыць напісанне дысертацыйнай работы ў перыяд навучання ў аспірантуры. У выніку эфектыўнасць аспірантуры на эканамічным факультэце значна ніжэйшая за сярэднюю па БДУ. Калі за 2001—2005 гг. сярэдні працэнт абароны кандыдацкіх дысертацый у тэрмін па БДУ склаў каля 14,7 %, то на эканамічным факультэце — толькі 3,5 % (гл. дыяграму 2). На працягу 2003—2005 гг. у тэрмін былі абароненыя толькі 2 кандыдацкія дысертацыі (без уліку замежных грамадзян). Акрамя таго, за 2002—2006 гг. падрыхтавалі і абаранілі дысертацыі 2 замежныя аспіранты.

*Дыяграма 3*

### Агульная колькасць аспірантаў па гадах




Падводзячы вынікі, камісія прапанавала Вучонаму савету універсітэта ў цэлым ухваліць працу факультэта па выкананні праграм перспектыўнага развіцця і адзначыла, што для паляпшэння работы факультэта прыярытэтнымі напрамкамі павінны стаць:

— удасканаленне арганізацыі самастойнай работы студэнтаў;

— паглыбленне практычнай накіраванасці вучэбнага працэсу;

—стварэнне дзейснай сістэмы размеркавання выпускнікоў;

— павышэнне эфектыўнасці навукова-даследчай работы студэнтаў і аспірантаў.

# ФОРУМ БЕЗ ГАЛЬШТУКАЎ

***У нашым універсітэце 28 студзеня — 2 лютага адбыўся Другі з'езд студэнцкіх і маладзёжных арганізацый ВНУ краін СНД. Ён быў прысвечаны актуальным пытанням дзяржаўнай маладзёжнай палітыкі і сацыяльнага становішча студэнцтва, перспектывам развіцця маладзёжнага руху і студэнцкага самакіравання ў Беларусі і краінах СНД.***

У форуме прынялі ўдзел каля 100 дэлегатаў з Беларусі, Расіі, Украіны, Арменіі, Азербайджана і Казахстана. Яны сустрэліся з міністрам адукацыі Беларусі Аляксандрам Радзьковым, рэктарам БДУ прафесарам Васілём Стражавым, першым сакратаром ЦК БРСМ Леанідам Кавалёвым. Акрамя таго, маладзёжныя лідэры наведалі Палату прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, штаб-кватэру Садружнасці Незалежных Дзяржаў і Мінскі гарадскі камітэт БРСМ.

Для дэлегатаў форуму была падрыхтавана і вялікая пазнавальная культурна-спартыўная праграма: спартландыя на базе САК "Брыганціна", наведванне Мінскага аўтамабільнага завода, Нацыянальнага тэатра імя Янкі Купалы, экскурсіі ў Мірскі замак, музей народнай архітэктуры і побыту ў Строчыцах.

***На пытанні нашай газеты адказаў Ілля Ільін, старшыня Каардынацыйнага савета Супольнасці студэнцкіх і маладзёжных арганізацый, старшыня Маладзёжнага савета Маскоўскага дзяржаўнага універсітэта:***



**– На семінарах і сустрэчах Вы пазнаёміліся з асновамі дзяржаўнай маладзёжнай палітыкі нашай краіны. Якія можаце назваць асаблівасці ў параўнанні з расійскай сітуацыяй?**

– У кожнай краіны ўласныя асаблівасці – і ў сістэме адукацыі, і ў сістэме дзяржаўнай улады. У Расіі зараз — перыяд падрыхтоўкі да выбараў, і гэта накладае свой адбітак. Пасля ўкраінскай "памаранчавай рэвалюцыі" ў нас склалася новае разуменне маладзёжнай палітыкі, яна стала яркай і стракатай, з'явілася шмат новых арганізацый, рухаў. Ёсць Расійскі саюз моладзі, што створаны на базе былога ЦК ЛКСМ, але ён не з'яўляецца адзінай цэнтралізаванай арганізацыяй. Гэта кангламерат самастойных арганізацый, якіх падтрымліваюць розныя сілы. У нас многа эксперыментаў, новых форм, і ўпарадкоўвацца ўсё гэта пачало толькі нядаўна. 18 снежня была прынята Стратэгія дзяржаўнай маладзёжнай палітыкі Расійскай Федэрацыі, якая зараз напаўняецца канкрэтным зместам. Ёсць таксама шэраг федэральных праграм для падтрымкі маладых навукоўцаў, што прадугледжваюць персанальную адрасную дапамогу.

**– У нас існуюць студэнцкія саветы па якасці адукацыі, іншыя арганізацыі студэнцкага самакіравання. Як выглядае гэта сістэма ў МДУ?**

– З мінулага года сур'ёзна займаемся гэтым пытаннем. Ва ўсіх класічных ВНУ падобныя органы так ці інакш існуюць. МДУ налічвае сто тысяч чалавек, каля 40 тысяч з іх – студэнты. У мінулым годзе мы адзначалі 225 гадоў студэнцкага руху. Першы студсавет у нас быў створаны 30 кастрычніка 1990 года яшчэ пры камітэце камсамола універсітэта. Пасля з'явіліся гарачыя галовы, што кінуліся ламаць былыя ўстоі. На гэты працэс паўплывала вялікая палітыка, якая ўнесла свае карэктывы. Калі напрыканцы 90-х пачаў ствараецца Расійскі саюз студэнтаў, мы зноў сутыкнуліся са зменай палітычных сістэм і былі адкінуты на ніву палітычнай кан'юнктуры. Зараз дзейнічаюць іншыя людзі, у іх ёсць падтрымка з боку адміністрацыі розных узроўняў, таму залежнасць ад палітычных падзей памяншыцца.

**– Нашы маладзёжныя арганізацыі шмат увагі надаюць выхаванню лідэраў. Ці займаюцца гэтым мэтанакіравана ў Маскоўскім дзяржаўным універсітэце?**

– Выхоўваць актыўную асобу трэба з самага маленства. Таму гэты працэс бясконцы. Але, як вядома, студэнцкая пяцігодка ў жыцці многіх становіцца лёсавызначальнай. Адукацыя і выхаванне — знітаваныя. У МДУ няма асобнага ўпраўлення па выхаваўчай рабоце ці прарэктара, які б спецыяльна займаўся такой работай. Выхаванне адбываецца ў рамках дзейнасці маладзёжных арганізацый, падчас сустрэч з рэктарам, якога нашы студэнты шчыра любяць і паважаюць. Кожны прафесар, калі наведвае студэнтаў у інтэрнаце, выступае менавіта як выхавацель. Творчае атачэнне, магчымасць рэалізаваць сябе ў шматлікіх арганізацыях "па інтарэсах", векавыя традыцыі універсітэта – гэта тое, што пазбаўляе нас неабходнасці мець строгую сістэму выхавання.

**– Што ўяўляе сабой Супольнасць студэнцкіх і маладзёжных арганізацый, якія канкрэтныя праграмы рэалізуе?**

– Супольнасць была створана на аснове ідэй Еўразійскай студэнцкай асацыяцыі, якая мусіла стрымаць у 90-я "разбяганне" адукацыйных сістэм ВНУ былога Савецкага Саюза. Але на такой вялікай прасторы нельга стварыць аб'яднанне з паўнамоцным цэнтральным апаратам, ды гэта і не патрэбна. Мы сабраліся разам, пагаварылі, завязалася сяброўства — што яшчэ? Наша арганізацыя сеткавая, і яе не ўвасабляе начальнік у МДУ, які кіруе ўсімі рэгіянальнымі працэсамі. Аб'яднанне арганізацый адбывалася не таму, што камусьці захацелася прыгулашчыць сусветны маштаб, а таму, што задуманую справу паасобку не зрабіць. Ва ўсіх вышэйшых навучальных установах галоўным з'яўляецца навука, адукацыя, прафесійнае самаўдасканаленне. Маскоўскі праект "Ламаносаў" 15 год таму стаў рабочай асновай, вакол якой усё і закруцілася. Зараз гэта наша агульнае мерапрыемства. Зладзіць яго няпроста, бо збіраецца вялікая колькасць людзей і ўсе з рознымі характарамі, са сваімі уласнымі інтарэсамі. Беларускі дзяржаўны універсітэт заўсёды быў актыўны, а многіх беларускіх калег ведаю асабіста з 1990 года.

**– Наколькі плённа, на Вашу думку, прайшоў другі форум?**

– Ваша арганізацыйная сістэма дазваляе праводзіць маштабныя мерапрыемствы. МДУ робіць штосьці падобнае тры разы на год. Мы добра разумеем, колькі намаганняў трэба прыкласці, каб утаймаваць першапачатковы хаос, распрацаваць змястоўную праграму, атрымаць істотныя вынікі. Таму магу аўтарытэтна даць высокую адзнаку арганізацыйным здольнасцям нашых беларускіх калег і сяброў. З уражанняў: крыху холадна, Мінск – самавіты горад, грунтоўны і чысты, Беларусь – краіна са сваімі



асаблівасцямі, традыцыямі, а пэўнае напружанне паміж палітычнымі вярхамі нашых краін не замінае ўзаемнай ветлівасці і сяброўскім адносінам. Энергетыка форуму вельмі моцная, канструктыўная. Беларусы зараз на чале маладзёжнага савета СНД і выступаюць з шэрагам прапаноў – вас чакае актыўны ўдзел у акцыях, навуковых мерапрыемствах і г.д. Мы думаем пра далейшае развіццё, на сённяшні дзень у нас пяць ВНУ-кандыдатаў, гатовых правесці наступны форум. Мы імкнемся быць на хвалі падзей, далучаць усё новых людзей з розных рэгіёнаў Расіі і іншых краін СНД, Прыбалтыкі і з Польшчы. Гэта карпатлівая праца мусіць неўзабаве выйсці на новы якасны ўзровень. А пакуль ідзе стадыя афармлення і накаплення, для якой мінскі форум – важны ўнёсак і значны імпульс.

***Настасся Шартынава, старшыня студсавета юрыдычнага факультэта, сакратар Асацыяцыі грамадскіх аб'яднанняў студэнтаў Ніжагародскага дзяржаўнага універсітэта:***

Варта адзначыць высокі ўзровень арганізацыі форуму, удалае размеркаванне часу дэлегатаў – для занятых людзей гэта вельмі важна. Тыя дні, што мы правялі ў Мінску, былі вельмі прадуктыўнымі. Я, напрыклад, даведалася пра некалькі сродкаў паляпшэння той сітуацыі, з якой сутыкнулася ў сябе на радзіме. Наш універсітэт – найбуйнейшая ВНУ ў рэгіёне, дзе навучаецца 42 тысячы студэнтаў. Скаардынаваць 17 факультэтаў, 9 арганізацый – сур'ёзная задача. Але цяпер мы маем досвед, якім абавязкова падзелімся з кіраўніцтвам. У Казахстанскім універсітэце — адна сістэма, а ў БДУ ўвогуле існуе каля 15 арганізацый, і ўсе выдатна функцыянуюць. Чаму ж не запазычыць добры вопыт. Дарэчы, прыстасаванне да беларускіх умоў арганізатары зрабілі надзіў лёгкім – сустрэлі нас на вакзале, патлумачылі, як пераводзіць нашы рублі ў вашы. Мы падзіцячы радаваліся аграмадным тысячам, якія атрымалі... Усе мы ехалі сюды падзяліцца ідэямі. Але не ў тых афіцыйных абставінах, калі людзі, заціснутыя ў гальштукі, баяцца вымавіць лішняе слова, прыйсці не ў час – ад такіх з'ездаў, на маю думку, мала сэнсу. На гэтым форуме мы імкнуліся дасягнуць максімальнай эфектыўнасці з мінімумам фармальнасцяў. Шчыра абмяркоўвалі праблемы, разглядалі цікавыя праекты, якія будзем рэалізоўваць ужо на месцах.

***Ягор Уласаў, намеснік старшыні студэнцкага савета Самарскага дзяржаўнага тэхнічнага універсітэта, старшыня студэнцкага савета інжынерна-эканамічнага факультэта:***

Мае ўражанні – гэта здзіўленне ад маштабнасці мерапрыемства. Не чакаў, што будзе столькі дэлегацый. Хоць СДТУ зусім недалёка ад Ніжняга Ноўгарада, але гэта прынцыпова іншая ўстанова, дзе выкарыстоўваюцца адрозныя падыходы ў арганізацыі адукацыйнага працэсу. Мы таксама зацікаўлены ў яго ўдасканаленні. Беларусь, Казахстан, Азербайджан, Арменія — усюды свае адметнасці, свае плюсы і мінусы. Вельмі карысна пазнаёміцца з тутэйшай сітуацыяй, зрабіць адпаведныя высновы. Дзякуючы форуму, дзе пытанням самакіравання надавалася нямала ўвагі, я зразумеў, што у Расіі работа з моладдзю дастаткова не рэгламентавана, кожны робіць, што хоча і як можа. Няма мэтанакіраванай маладзёжнай палітыкі. Нам таксама неабходна рыхтаваць кадры на замену, бо новая сітуацыя патрабуе новага пакалення лідэраў. Многія хочуць дзейнічаць, але не ведаюць як, ініцыятыва зводзіцца да дробных акцый без агульнай стратэгіі і мае лакальны характар. Калі прыедзем дамоў, адразу звернемся да кіраўніцтва універсітэта з прапановамі, якія нарадзіліся ў нас падчас гэтага з'езду. Вашы студэнты вельмі ўразілі — так гарань у іх вочы, такое жаданне рабіць штосьці карыснае! Вельмі парадаваліся за беларускую зямлю!

***Арман Аспанаў, старшыня камітэта па справах моладзі Еўразійскага нацыянальнага універсітэта (Казахстан):***

Найбольш мяне зацікавіла інфармацыя пра студэнцкія арганізацыі і маладзёжныя мерапрыемствы, што адбудуцца ў гэтым годзе ў розных кутках СНД. Нашы студэнты абавязкова прымуць удзел. Апошнія гадоў пяць у Казахстане працуе маладзёжны парламент – орган, які мае ўплыў на маладзёжную палітыку ў краіне. У САК "Брыганціна" нам распавялі пра структуру студсавета БДУ, структуру БРСМ – літаральна ўсю інфармацыю я "зпампаваў" у электронным выглядзе, бо ў Рэспубліцы Беларусь сканструявана такая сістэма, якую мы можам з поспехам прымяняць у сябе. У вас вельмі прадуктыўна працуе моладзь, маладзёжныя арганізацыі – гэта надае і пазітыўную сацыяльную дынаміку. На форуме завязаліся новыя кантакты, многія абмяняліся рабочымі планамі. Зараз думаем, дзе і як праводзіць трэці з'езд і фарміруем групу, якая будзе прымаць у ім удзел. Дзякуй вашаму універсітэту за цёплую і ў той жа час дзелавую атмасферу.

***Аюна Хайдапава, намеснік старшыні прафкама студэнтаў і аспірантаў Бурацкага дзяржаўнага універсітэта:***

Прыехаць да вас нам параілі ў Маскве, дзе мы, як і большасць іншых дэлегатаў, спрычыніліся да святкавання Дня студэнта. Дарога доўгая, навучальны працэс ідзе, таму мы спачатку вагаліся. Але калі прыехалі – не пашкадавалі. Увачавідкі ўпэўніліся, што Беларусь вельмі ветлівая, а людзі тут жывуць прыязныя і разумныя. Столькі новых сяброў! Самым яркім і карысным на форуме для мяне стаў распавед пра структуру вашых маладзёжных арганізацый – у нас няма нічога падобнага. Цікава было наведваць псіхалагічныя трэнінгі, але і секцыі не знудзілі. Дарэчы, кухня ў вас проста цуд! Нават дамоў вяртацца не хочацца!

***Павел Скалабан, начальнік упраўлення выхаваўчай работы з моладдзю Беларускага дзяржаўнага універсітэта:***

Першы з'езд маладзёжных і студэнцкіх арганізацый ВНУ краін СНД адбыўся ў жніўні 2006 года ў Нальчыку. Яго зладзіў Каардынацыйны савет Супольнасці студэнцкіх і маладзёжных арганізацый. Акрамя таго, Маладзёжны савет МДУ праводзіць у красавіку штогадовую студэнцкую канферэнцыю "Ламаносаў", а таксама маштабнае святкаванне Дня расійскага студэнцтва 25 студзеня, куды збіраюцца прадстаўнікі шматлікіх універсітэтаў. Гэта самыя актыўныя і зацікаўленыя ў супрацоўніцтве маладыя лідэры. Іх першая сістэмная сустрэча адбылася якраз летам мінулага года. Яе фарматам былі ўсе задаволены. Наша дэлегацыя прапанавала правесці наступны маладзёжны форум у Мінску на зімовых канікулах, з чым і пагадзіліся. Графік атрымаўся досыць шчыльны, галоўная задача была – паказаць краіну, людзей, універсітэт, і з гэ-



тым мы паспяхова справіліся. Акрамя таго, умацавалі кантакты са сваімі калегамі. Такія нефармальныя зносіны – рэч нават больш істотная, чым папяровыя дамовы. Паперы падпісваюць, падшываюць ў папку і забываюць. А вось час, праведзены разам, – гэта зусім іншае. Што тычыцца Трэцяга маладзёжнага форуму, то ён, верагодна, адбудзецца ў горадзе на Няве — такую прапанову зрабіў старшыня студэнцкага савета Санкт-Пецярбургскага універсітэта Андрэй Бехцераў. Хутчэй за ўсё чарговае мерапрыемства пройдзе яшчэ ў гэтым годзе.

**Падрыхтавала Маргарыта АЛЯШКЕВІЧ**

**Фота БелТА і Сяргея СТРАЛКОЎСКАГА**

## ПАДЗЯКА З МАСКВЫ

**На імя рэктара БДУ прафесара Васіля Стражава прыйшоў ліст ад рэктара Маскоўскага дзяржаўнага універсітэта Віктара Садоўнічага, у якім ён выказаў шчырую падзяку за бліскучую арганізацыю і правядзенне Беларускім дзяржаўным універсітэтам II З'езду Супольнасці студэнцкіх і маладзёжных арганізацый. Рэктар МДУ выразіў упэўненасць, што супрацоўніцтва актыўнай моладзі з'яўляецца важнейшым залогам будучай разумнай і справядлівай інтэграцыі на прасторы СНД...**

**Паводле інфармацыі прэс-службы БДУ**

ВЕДАЙ НАШЫХ!

# СПАРТЫЎНЫ ГОНАР БДУ

***Як вядома, у Беларускім дзяржаўным універсітэце вучацца і працуюць людзі самыя здольная і мэтанакіраваныя. Менавіта таму гэта ВНУ лічыцца самай прэстыжнай у краіне. Прадстаўнікі БДУ паспяхова выступаюць і на міжнародных спартыўных спаборніцтвах. Нядаўна на Сусветнай зімовай універсіядзе ў Турыне студэнткі гістарычнага факультэта Алена Саннікава і Вольга Васілёнак заваявалі золата ў лыжнай эстафеце 3х5 км у складзе зборнай Беларусі. Пераможцы падзяліліся ўражаннямі і меркаваннямі наконт свойго студэнцкага і спартыўнага жыцця:***



**- Ці спадзяваліся вы на такі бліскучы выступ?**

(Алена) Дакладна тое, што ехалі за медалём. Пасля трох запар заваяваных чацвёртых месцаў жаданне ўзыйсці на п'едэстал біла праз край. Тым больш, што каманда персанальна ўзмацнілася, быў таксама праведзены вельмі патрэбны трэніровачны збор у італьянскім Бальцано, які дапамог з адаптацыяй. На трасе мы вылажыліся да апошняга і здолелі апярэдзіць моцныя каманды Украіны, Казахстана і Расіі.

**- Што адчувалі, стоячы на найвышэйшай прыступцы?**

(Вольга) Перш-наперш, гонар за Радзіму. Было прыемна, калі для ўсіх прысутных гучаў наш нацыянальны гімн. Але вялікі ажыятаж з боку мас-медыя і фізічнае спусташэнне прывялі ў пэўнае замяшанне. Значнасць гэтага дасягнення да канца ўсвядоміць яшчэ не ўдалося.

**- Якое месца займае спорт у вашым жыцці?**

(Алена) Безумоўна, на гэты момант ён – галоўны прыярытэт. Але спартыўнае жыццё кароткае, а трэнерская прафесія – нежаночая справа. Таму мы клапоцімся і пра другую вышэйшую адукацыю (абедзве скончылі установы фізічнай культуры. — *Рэд.*), дзеля гэтага і паступілі на гістарычны факультэт. Спалучаць спартыўную дзейнасць з вучобай складана, але дэканат ідзе насустрач і дазваляе здаваць зімовую сесію ўвесну. Я паспела яшчэ і выйсці замуж.

**- Што вам, маладым і перспектыўным спартсменкам, патрэбна, каб дасягнуць гэткіх поспехаў і на дарослым узроўні?**

(Вольга) Пры добра наладжаным і забяспечаным трэніровачным працэсе мы зможам атрымаць адпаведную падрыхтоўку. З ёй прыйдзе і псіхалагічная ўпэўненасць. У вышэйшым спорце ўсё павінна быць на грунтоўнай аснове, а месца для забабонаў у ім няма, бо кожная неістотная акалічнасць можа сапсаваць настрой, без якога "золата" атрымаць нельга. Адзіная мая традыцыя – ніколі на спаборніцтвах не выступаць у новай вопратцы, а так я заўсёды разлічваю толькі на свае фізічныя магчымасці. (Дарэчы, на мінулым тыдні Вольга Васілёнак выйграла чэмпіянат рэспублікі. — *Рэд.*).

***

Трэнер слаўных дзяўчат Людміла Аляксандраўна Капылова таксама не сумняваецца ў далейшых поспехах сваіх падапечных, бо адзначае ў іх незвычайную працавітасць і бясконцы аптымізм. Наперадзе – чэмпіянат свету ў Японіі.

**Лейла ІСМАІЛАВА**
**Фота Сяргея СТРАЛКОЎСКАГА**

ДАЛУЧАЙЦЕСЯ!

# КРОПЛЯ МІЛАСЭРНАСЦІ

***Кожны год Цэнтральны камітэт прафсюза работнікаў навукі і адукацыі распачынае дабрачынныя мерапрыемствы для выхаванцаў дзіцячых сацыяльных прытулкаў. Як заўсёды гэту ініцыятыву вельмі актыўна падтрымлівае адна з найбольш буйных яго пярвічных арганізацый — студэнцкі прафсаюз Белдзяржуніверсітэта, які ўзначальвае Ніна Міхайлаўна Радзевіч. Па словах старшыні, нашы студэнты адрозніваюцца асаблівай добразычлівасцю і спраўнасцю. Пацверджаннем таму служыць шэраг адпаведных акцый.***

Так, яшчэ напярэдадні Новага года група студэнтаў гуманітарнага факультэта наведала дзіцячы анкалагічны цэнтр у Бараўлянах (пра гэту акцыю мы пісалі раней на старонках газеты.– *Рэд.*) і пастаралася зрабіць малечам святочны настрой. Усе былі вельмі ўзрушаны і дамовіліся сустракацца надалей. Дарэчы, перад гэтай паездкай кожны са студэнтаў мусіў прайсці гутарку з псіхолагам.

Наступнай акцыяй стала наведванне Стаўбцоўскага дзіцячага сацыяльнага прытулку. Актывісты прафсаюза на чале з кіраўніком прывезлі розныя падарункі, шмат дзіцячых кніжак на суму 200 тыс. рублёў, а таксама прынялі ўдзел у навагоднім пакасе. Студэнты факультэта міжнародных адносін перадалі тамтэйшым выхаванцам вялікую колькасць канцылярскіх прылад.

Акрамя таго, у рамках акцыі "Прафсаюзы – дзецям" у Рэспубліканскім палацы культуры прафсаюзаў прайшла агульная ёлка. Дзеці наведалі цырк і паглядзелі спектакль "Папялушка", які зладзілі прафсаюзныя творчыя калектывы, і, канешне, атрымалі салодкія гасцінцы.

Варта адзначыць, што на гэтым усё не скончылася, бо 30 студзеня 2007 года адбылася паездка ў Лагойскі дзіцячы прытулак. Праграма ўключала спектакль "Кошкін дом" з удзелам дзіцячага танцавальнага калектыву "Літарынка" і маладзёжнага тэатра "На балконе". Прадстаўленне працягнуў студэнцкі гурток інстытута тэалогіі "Батлейка" з пастаноўкай "Кто на свете всех добрее?". Напрыканцы дзеткі атрымалі цацкі.



Прафсаюзная арганізацыя студэнтаў БДУ плануе і надалей аказваць падтрымку дзіцячым сацыяльным установам, каб зрабіць жыццё дзяцей больш радасным і шчаслівым. Тых, хто не абыякавы да гэтай праблемы, запрашаем далучацца. Будзем рады любой дапамозе.

**Надзея ДРЫЛА,**
**старшыня прафбюро факультэта журналістыкі**

ВІНШУЕМ!

# МЕДАЛІ ЛІЦЭІСТАЎ

На міжнароднай Жаўтыкоўскай алімпіядзе па фізіцы і матэматыцы, якая адбывалася з 14 па 20 лютага 2007 г., каманда ліцэя БДУ заняла абсалютнае чацвёртае месца і атрымала дыплом II ступені. У індывідуальным заліку былі заваяваны 1 залаты і 2 срэбраныя медалі. Золата і абсалютнае першае месца па фізіцы заняў Аляксандр Глымбоцкі (клас 11 Ф-2), срэбраныя медалі — Максім Севелеў (фізіка, клас 11 Ф-2) і Яўген Галіноўскі (матэматыка, клас 11 М-2). Два іншыя ўдзельнікі каманды — Аляксандр Ланкевіч і Андрэй Малевіч (вучні 10-га класа) — таксама паспрыялі агульнакаманднаму дасягненню.

Гэтая алімпіяда ладзіцца штогод на базе Рэспубліканскай спецыялізаванай фізіка-матэматычнай школы-інтэрната імя акадэміка О. Жаўтыкова (г. Алматы) пры падтрымцы Міністэрства адукацыі і навукі Рэспублікі Казахстан. З кожным годам колькасць удзельнікаў у ёй павялічваецца. На гэты раз прыслалі ўдзел больш за 250 чалавек з 156-ці краін — усяго 39 каманд. Яны прадстаўлялі спецыялізаваныя вучэбна-навуковыя цэнтры Маскоўскага, Новасібірскага універсітэтаў, Акадэмічны гімназіі СПбДУ. Былі таксама госці з Румыніі, Азербайджана, Украіны, Арменіі, Казахстана і інш.

Каманда ліцэя БДУ ўдзельнічала ў гэтых спаборніцтвах другі раз. У мінулым годзе нашыя навучэнцы занялі абсалютнае першае каманднае месца, заваяваўшы 3 залатыя і 1 бронзавы медалі ў індывідуальным заліку.

**Таццяна КАЛЕВІЧ,**
**дырэктар ліцэя БДУ**

У ВОЛЬНЫ ЧАС

# БЕЛАРУСКІЯ КАЛЯДЫ Ў АНГЛІІ

Творчая група ўпраўлення па справах культуры БДУ з 3 па 10 студзеня 2007 г. з дабрачыннай акцыяй наведала г. Кроўлі (Вялікабрытанія). Гэта мерапрыемства праводзілася па ініцыятыве англійскага калектыву «IFIELD BARN THEATRE» і было прысвечана 20-годдзю трагедыі на Чарнобыльскай АЭС. У праекце сярод беларускіх гасцей прымалі ўдзел Народны студэнцкі тэатр БДУ "На балконе" (рэжысёр — Сяргей Турбан) і Узорны дзіцячы ансамбль "Літарынка" (балетмайстар – Канстанцін Зубік).

Беларусы паказалі юным гледачам зімовую містэрыю "Калядная шкатулка". Праграма складалася з музычнай казкі "Кошкін дом" паводле п'есы С.Я.Маршака. Акрамя гэтага маленькія гледачы разам з бацькамі вадзілі карагоды вакол ёлкі, удзельнічалі ў конкурсах і гульнях, мелі магчымасць атрымаць падарункі ад беларускага Дзеда Мароза і яго ўнучкі Снягуркі.

Жыхары г. Кроўлі і іншых англійскіх гарадоў засталіся неабыякавымі да правядзення дабрачыннай акцыі. Як вынік — перапоўненыя залы падчас паказу, шчырая ўдзячнасць і шчодрыя ахвяраванні. Выручаныя сродкі будуць пералічаны аднаму з дзіцячых дамоў Беларусі. Акрамя таго, юныя артысты з ансамбля "Літарынка" паспяхова выступілі ў цэрквах і каледжы г. Кроўлі.

Творчыя калектывы ўпраўлення па справах культуры БДУ і «IFIELD BARN THEATRE» з глыбокім задавальненнем падвялі вынікі згаданай акцыі і выказалі ўпэўненасць у далейшым плённым супрацоўніцтве, якое павінна садзейнічаць культурнаму абмену і сяброўскім стасункам паміж беларускім і братанскім народамі.

**Кацярына САЛАДУХА,**
**намеснік начальніка ўпраўлення па справах культуры**

ЗДАРОЎЕ

# ЗАПРАШАЕМ НА АЗДАРАЎЛЕННЕ

***Студэнцкі санаторый-прафілакторый Беларускага дзяржаўнага універсітэта аб'яўляе графік заездаў на дзённы стацыянар для аздараўлення ў першым паўгоддзі 2007 года:***

1) з 15.02 па 07.03.2007 г.;
2) з 12.03 па 01.04.2007 г.;
3) з 03.04 па 23.04.2007 г.;
4) з 25. 04 па 17.05.2007 г.;
5) з 21.04 па 10.06.2007 г.;
6) з 11. 06 па 01.07.2007 г.

Студэнцкі санаторый-прафілакторый размешчаны ў зялёнай прыгараднай зоне (пас. Шчомысліца) і цалкам займае 2-гі паверх студэнцкага інтэрната № 3.

Да цэнтра горада (Галоўны вучэбны корпус БДУ) можна даехаць гарадскім аўтобусам – маршрут № 47.

У гэтым жа раёне знаходзіцца прыродны запаведнік рэспубліканскага значэння "Дуброва", які валодае высокім рэкрэацыйным патэнцыялам, выконвае важныя санітарна-гігіенічныя функцыі і з'яўляецца крыніцай гаючага паветра ў ваколіцах.

Студэнты, што знаходзяцца тут на аздараўленні, забяспечваюцца трохразовым харчаваннем у сталовых БДУ. Сума талонаў на харчаванне ў 5 разоў перавышае кошт пуцёўкі.

Для атрымання пуцёўкі ў санаторый-прафілакторый неабходна падаць:

1) заяву на імя старшыні камісіі па аздараўленні з указаннем тэрміну заезду, падпісаную намеснікам дэкана факультэта;

2) медыцынскую даведку для атрымання пуцёўкі ў санаторна-курортную ўстанову (выпісвае тэрапеўт па месцы жыхарства – форма 070 у-02).

Кошт пуцёўкі з 01.01.2007 г. складае 23 тыс. рублёў.

**Наш адрас: праcп. Незалежнасці, 4, к. 204, упраўленне выхаваўчай работы з моладдзю; тэл. 209-52-75. Працуем з 9.00 да 17.15.**

**Вольга КАЗАКОВА,**
**загадчык сектара сацыяльнай работы упраўлення выхаваўчай работы з моладдзю**

## Даведка

**Сярод студэнтаў БДУ ў 2006 г. зарэгістравана 8454 выпадкі захворванняў, што складае 1044,6 выпадкаў на 1000 студэнтаў (сярод іншагародніх). У параўнанні з 2005 г. адзначаецца рост агульнага захворвання на 31,5 % . Асабліва павялічыліся захворванні органаў дыхання (+78,7 %), стрававання (+64,8 %), мочапалавой сістэмы (+36,2 %), а таксама траўмы і атручэнні (+23,1 %). На канец года на дыспансерным уліку ў тэрапеўтаў знаходзілася 290 чалавек, што на 11,1 % болей, чым у 2005 г.**

**У 2006 г. 91 студэнт БДУ атрымаў стацыянарнае лячэнне. Рост шпіталізацый у дзённы стацыянар склаў 53 % у параўнанні з 2005 г.**

**Памятайце, здароўе – гэта самае важнае, што ёсць у чалавека. Беражыце яго з малады гадоў.**

**Паводле інфармацыі 33-й студэнцкай паліклінікі**

## НАВІНЫ СТУДГАРАДКА

У студзені былі падведзены вынікі агляду-конкурсу "Лепшы студэнцкі інтэрнат Кастрычніцкага раёна сталіцы", у якім ацэньваліся жыллёва-бытавыя ўмовы пражывання студэнтаў, арганізацыя ідэалагічнай і выхаваўчай работы, а таксама дзейнасць органаў студэнцкага самакіравання. Пераможцай у конкурсе па праву быў прызнаны інтэрнат № 1 БДУ. Віншуем!

* * *

Інтэрнат № 4 БДУ стаў пераможцай у намінацыі "Спартыўна-аздараўленчая работа" агляду-конкурсу таленавітай моладзі "Лідэр-2006", арганізаваным аддзелам па справах моладзі Адміністрацыі Цэнтральнага раёна г. Мінска.

* * *

8 лютага 2007 года споўнілася 5 гадоў Цэнтру педагагічных тэхналогій Студэнцкага гарадка. У яго склад уваходзяць сацыяльныя педагогі, педагогі-арганізатары, інструктары па фізкультуры, якія працуюць непасрэдна ў інтэрнатах, і метадысты, што курыруюць кожны з напрамкаў выхаваўчай работы (ідэалагічны, сацыяльна-педагагічны, інфармацыйны, культурна-масавы, спартыўна-аздараўленчы).

За час існавання Цэнтра былі распрацаваны і рэалізаваны наступныя базавыя праграмы: "Студэнцкае самакіраванне", "Фарміраванне здаровага ладу жыцця ў студэнтаў", "Грамадская інфармацыйная служба", "Культурна-забаўляльная дзейнасць студэнцкай моладзі", "Турызм і адпачынак", "Працоўнае лета". Акрамя гэтага, выйшла больш за 20 навукова-метадычных і навукова-практычных выданняў, арганізавана і праведзена больш за 50 семінараў-практыкумаў і метадычных заняткаў.

Асаблівую ўвагу Цэнтр надае праграме "Студэнцкае самакіраванне", у аснове якой – фарміраванне актыўнай жыццёвай пазіцыі ў студэнцкай моладзі, яе сацыяльнай сталасці, арганізацыі забаў пазнавальнага характару, а таксама правядзенне круглагадовай Школы студэнцкага актыву.

Сёння Цэнтр займае важнае месца ў структуры Студэнцкага гарадка універсітэта як сучасны арганізацыйны цэнтр падтрымкі маладзёжных ініцыятыў, рэалізацыі практычнай выхаваўчай работы і ўкаранення перадавых педагагічных тэхналогій.

**Паводле інфармацыі Студгарадка**

## СПАРТАКІЯДА

# ВОСЬ ТАКАЯ ФІЗКУЛЬТУРА!

***У Беларускім дзяржаўным універсітэце падведзены вынікі спартакіяды "Здароўе" ў 2006—2007 гг. сярод супрацоўнікаў.***

Пераможцай стала каманда факультэта радыёфізікі і электронікі. На другім месцы – кафедра фізічнага выхавання і спорту, на трэцім – фізічны факультэт.

У спаборніцтвах прымалі ўдзел каманды ўсіх падраздзяленняў БДУ па 7-мі відах спорту: баскетболе, валейболе, міні-футболе, плаванні, шахматах, настольным тэнісе і армрэстлінгу.

Узнагароджванне пераможцаў адбылося ў рамках акцыі "Дні здароўя", якая прайшла з 9 па 11 лютага на базе САК "Брыганціна", што ў Радашковічах.

У "Днях здароўя" прынялі ўдзел каля 250-ці супрацоўнікаў Белдзяржуніверсітэта. Яны прадэманстравалі спартыўную падрыхтоўку ў асабістых спаборніцтвах па лыжах, плаванні, настольным тэнісе, більярдзе, перацягванні каната і шахматах.

"Дні здароўя" праводзяцца прафсаюзнай арганізацыяй супрацоўнікаў БДУ ў трэці раз з мэтай прапаганды здаровага ладу жыцця і фізічнай культуры сярод работнікаў Белдзяржуніверсітэта.

**Паводле інфармацыі прафкама супрацоўнікаў БДУ**

## ЮБІЛЕЙ

# СЛАВУТЫ АСІЛАК

***У мінулым годзе вядомы беларускі атлет Віктар Кавалёў адзначыў 60-годдзе спартыўнай дзейнасці.***

Віктар Фёдаравіч Кавалёў нарадзіўся ў 1928 г. у Гарадке Віцебскай вобласці. У 1946 г. пачаў займацца цяжкай атлетыкай, а ўжо праз два гады перамог на рэспубліканскіх спаборніцтвах, пасля чаго быў запрошаны ў зборную Беларусі. У 1950 г. заняў другое месца на Усесаюзным конкурсе асілкаў і стаў майстрам спорту. Ён застаўся членам нацыянальнай каманды да 42-х гадоў. І нават пасля гэтага не пакінуў улюбёную справу, а з поспехам удзельнічаў у спаборніцтвах для ветэранаў.

На еўрапейскім чэмпіянаце штангістаў-ветэранаў у Венгрыі ў 1999 г. В. Кавалёў атрымаў трэці залаты медаль. У 2003 г. у Францыі (майстру тады было 75 гадоў) ізноў стаў найлепшым у сваёй узроставай катэгорыі ў вазе да 94-х кг. Праз год ён устанавіў еўрапейскі рэкорд і заваяваў пяты тытул чэмпіёна кантынента. Акрамя таго, В. Кавалёў з'яўляецца 12-разовым рэкардсменам Беларусі сярод ветэранаў, а таксама суддзёй міжнароднай катэгорыі.

З 1955 г. Віктар Фёдаравіч працуе на кафедры фізвыхавання і спорту ў нашым універсітэце. Адначасова 26 гадоў ён узначальваў федэрацыі цяжкай атлетыкі і сілавых відаў спорту Мінска і Беларусі, атрымаў званне Заслужанага трэнера БССР.

За паўстагоддзе працы ў БДУ В. Кавалёў выхаваў 75 майстроў спорту і 7 майстроў міжнароднага класа. Многія яго вучні-цяжкаатлеты з'яўляюцца чэмпіёнамі і рэкардсменамі Беларусі, Савецкага Саюза, Еўропы і свету.

Некалькі гадоў таму Віктар Фёдаравіч стаў ініцыятарам стварэння Беларускага грамадскага аб'яднання ветэранаў цяжкай атлетыкі. Заняткі спортам насамрэч сталі для яго сэнсам усяго жыцця.

**Пётр ПАЛЕСКІ**

## ГАРАЧАЯ ЛІНІЯ

***Калі плануецца стварэнне новых медыятэк, і дзе яны будуць размяшчацца?***

Як паведаміў "Універсітэту" прарэктар па адукацыйным інавацыям і інфармацыйным тэхналогіям Павел Мандрык, у бліжэйшы час адбудзецца адкрыццё медыятэкі ў вучэбным корпусе па вул. К.Маркса, 31 (зараз там знаходзяцца ФФСН, філалагічны і эканамічны факультэты). Неабходная тэхніка ўжо закуплена і рыхтуецца памяшканне, дзе яна будзе ўстаноўлена. Наступнай стане медыятэка на юрыдычным факультэце (вул. Ленінградская, 8). Камп'ютары для яе абсталявання яшчэ патрэбна набыць. На чарзе таксама стварэнне медыятэкі ў новым корпусе гуманітарных факультэтаў па вул. Кальварыйскай пасля ўвядзення будынка ў эксплуатацыю напрыканцы года.

**Тэлефон "Гарачай лініі": 209-54-16**

## АКТУАЛЬНА

# СТЫПЕНДЫЯТЫ ПРЭЗІДЭНЦКАГА ФОНДУ

Сем аспірантаў Беларускага дзяржаўнага універсітэта будуць атрымліваць штомесячныя стыпендыі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, вызначаныя адпаведным распараджэннем кіраўніка дзяржавы Аляксандра Лукашэнкі ў памеры 775 тыс. рублёў кожная. У спісе стыпендыятаў — 87 найлепшых аспірантаў з 46-ці ВНУ і навуковых арганізацый краіны. Сярод аспірантаў БДУ вылучаны Вадзім Гудзель (працоўнае права, права сацзабеспячэння), Настасся Акуленка (агульная псіхалогія), Дзмітрый Калінін (сусветная эканоміка), Павел Скумс (дыскрэтная матэматыка і матэматычная кібернетыка), Кірыл Кузьмін (дыскрэтная матэматыка і матэматычная кібернетыка), Анжаліка Альпэўская (тэорыя мовы) і Таццяна Панфёрава (тэорыя мовы).

**Паводле інфармацыі прэс-службы БДУ**

## ВЫДАТНЫЯ ІМЁНЫ БДУ

# ДА 100-ГОДДЗЯ З ДНЯ НАРАДЖЭННЯ ІВАНА ЛУШЧЫЦКАГА



20 студзеня споўнілася 100 гадоў з дня нараджэння вядомага беларускага філосафа і педагога Івана Мікалаевіча Лушчыцкага — доктара філасофскіх навук, прафесара, члена-карэспандэнта Акадэміі навук БССР, Заслужанага дзеяча навукі Рэспублікі Беларусь, удзельніка Вялікай Айчыннай вайны.

Іван Мікалаевіч нарадзіўся ў вёсцы Агароднікі Капыльскага раёна Мінскай вобласці. Пасля заканчэння універсітэта з 1930 г. па 1940 г. ён працаваў у Інстытуце філасофіі і права АН БССР. З 1947 г. — вучоны сакратар Прэзідыума АН БССР, намеснік дырэктара, дырэктар Інстытута філасофіі і права АН БССР.

Пачынаючы з 1953 г. на працягу 20-ці гадоў навуковая і педагагічная дзейнасць І.М.Лушчыцкага была звязана з БДУ, дзе ён загадваў кафедрай гісторыі філасофіі і логікі. Першым у савецкай Беларусі ён пачаў даследаваць філасофскую і грамадска-палітычную думку свайго народа і ў гэтым напрамку заснаваў навуковую школу, традыцыі якой сёння працягваюць яго вучні і маладыя навукоўцы нашай краіны.

У сярэдзіне мая на факультэце філасофіі і сацыяльных навук БДУ адбудзецца шэраг мерапрыемстваў, прымеркаваных да гэтага юбілею: міжнародная навуковая студэнцкая канферэнцыя памяці вядомага навукоўцы, выстава апублікаваных прац І.М.Лушчыцкага і іншых даследчыкаў у галіне айчыннай філасофскай думкі. У навуковым часопісе "Философия и социальные науки" будуць змешчаны матэрыялы, прысвечаныя жыццю і творчасці вучонага. Акрамя таго, плануецца адкрыццё мемарыяльнай вучэбнай аўдыторыі імя І.М.Лушчыцкага.

**Анатоль ЛЯГЧЫЛІН, намеснік дэкана факультэта філасофіі і сацыяльных навук**




**Другі з'езд студэнцкіх і маладзёжных арганізацый ВНУ краін СНД арганізаваны і праведзены БДУ** – «Знамя юности», 02.02.

**Уручэнне дыплома "Ганаровага прафесара БДУ" генеральнаму дырэктару Сусветнай арганізацыі інтэлектуальнай уласнасці Камілу Ідрысу** – «Рэспубліка», 01.02; «Настаўніцкая газета», 03.02.

**Прэзентацыя Рэспубліканскага інстытута імя Канфуцыя ў БДУ** – «Вечерний Минск», 29.01; «Белгазета», 29.01; «Настаўніцкая газета», 30.01; «Ва-банк», 01.02; «Звязда», 02.02; «Знамя юности», 02.02.

**Псіхалагічная служба БДУ** – «Рэспубліка», 27.01.

**Навуковыя даследаванні прафесара Васіля Шапялевіча і дацэнта Святланы Жукавай** – «Настаўніцкая газета», 27.01.

**Імя прафесара БДУ Вольгі Якушкі ўнесена ў энцыклапедыю "Кто есть кто. XX столетие"** – «Минский курьер», 27.01.

**Круглы стол на тэму "Асвятленне на старонках рэгіянальнага друку пытанняў культуры, мастацтва, народнай творчасці: традыцыі, новыя формы, магчымасці", які прайшоў на факультэце журналістыкі** – «Літаратура і мастацтва», 26.01.

**Інтэрв'ю з рэктарам БДУ Васілём Стражавым** – «Комсомольская правда в Белоруссии», 23.01.

**Навучанне кітайскіх студэнтаў у БДУ** – «Беларусь сегодня», 23.01.

**Новы навучальны курс у БДУ "Універсітэтазнаўства"** – «Настаўніцкая газета», 23.01.

**Беларуска-расійскія адносіны каменнтуе дэкан эканамічнага факультэта Міхаіл Кавалёў** – «Обозреватель», 19.01.

**Будаўніцтва новага навучальнага корпуса БДУ на вул. Кальварыйскай** – «Минский курьер», 18.01; «Звязда», 19.01; «Беларусь сегодня», 18.01.

**Фотагульня на факультэце журналістыкі** – «Минский курьер», 13.01.

**Навуковыя чытанні ў гонар прафесара Сцяпана Александровіча** – «Літаратура і мастацтва», 12.01.

**Адкрыццё Цэнтра турэцкай мовы і культуры** – «Минский курьер», 11.01.

**Інтэрв'ю з дэканам факультэта журналістыкі Сяргеем Дубовікам** – «Минский курьер», 11.01.

**Экзаменацыйная сесія на гуманітарным факультэце БДУ** – «Настаўніцкая газета», 09.01.

**Інфармацыя для абітурыентаў БДУ** – «Знамя юности», 05.01; «Вечерний Минск», 04.01; «Настаўніцкая газета», 09.01.

**Музей гісторыі БДУ** – часопіс «Беларусь», №1.

*Пра гэтыя і іншыя падзеі ў БДУ шырока паведамлялі ў сваіх матэрыялах інфармацыйныя агенцтвы, тэлеканалы, Беларускае радыё і FM-станцыі.*

**Паводле інфармацыі прэс-службы БДУ**

## АБ'ЯВЫ

### РЭКТАРАТ БЕЛАРУСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА

**аб'яўляе конкурс на замяшчэнне пасад:**

ЗАГАДЧЫКА КАФЕДРЫ фізікі паўправаднікоў і нанаэлектронікі;

ДАЦЭНТАЎ КАФЕДРАЎ: біяфізікі, методыкі выкладання фізікі і інфарматыкі, эканамічнай геаграфіі зарубежных краін, дынамічнай геалогіі, геаграфічнай экалогіі, англійскай мовы гуманітарных факультэтаў, беларускай літаратуры і культуры, рускай мовы, міжнароднага прыватнага і еўрапейскага права;

СТАРШЫХ ВЫКЛАДЧЫКАЎ КАФЕДРАЎ: методыкі выкладання фізікі і інфарматыкі, агульнай фізікі, сістэмнага аналізу, фізічнай геаграфіі мацерыкоў і акіянаў і методыкі выкладання геаграфіі, тэарэтычнай і інстытуцыянальнай эканомікі, англійскай мовы гуманітарных факультэтаў, фізічнага выхавання і спорту, англійскай мовы эканамічных спецыяльнасцяў, сучасных замежных моў;

ВЫКЛАДЧЫКАЎ КАФЕДРАЎ: геаграфічнай экалогіі, зарубежнай літаратуры, раманскага мовазнаўства, англійскай мовы гуманітарных спецыяльнасцяў, сучасных замежных моў, мытнай справы;

АСІСТЭНТАЎ КАФЕДРАЎ: сістэмнага аналізу, аналітычнай хіміі, арганічнай хіміі.

**Тэрмін конкурсу – адзін месяц з дня апублікавання аб'явы.**

**Адрас: 220030, г. Мінск, вул. Бабруйская, 5а, упраўленне кадраў, тэл. 209-54-36.**

### ДУА «ДЗЯРЖАЎНЫ ІНСТЫТУТ КІРАВАННЯ І САЦЫЯЛЬНЫХ ТЭХНАЛОГІЙ» БДУ

**аб'яўляе конкурс на замяшчэнне пасад:**

ДАЦЭНТА КАФЕДРЫ сацыяльнай работы;

ВЫКЛАДЧЫКА КАФЕДРЫ кіравання фінансамі і маёмасцю.

Тэрмін конкурсу – адзін месяц з дня апублікавання аб'явы.

**Адрас: 220037, г. Мінск, вул. Батанічная, 15, аддзел кадраў, тэл. 210-01-10.**

### ДУА «РЭСПУБЛІКАНСКІ ІНСТЫТУТ ВЫШЭЙШАЙ ШКОЛЫ»

**аб'яўляе конкурс на замяшчэнне пасад:**

ДАЦЭНТА КАФЕДРЫ філасофіі і метадалогіі універсітэцкага адукавання;

ДАЦЭНТА КАФЕДРЫ псіхалогіі і педагагічнага майстэрства;

СТАРШАГА ВЫКЛАДЧЫКА КАФЕДРЫ праектавання адукацыйных сістэм.

**Тэрмін конкурсу – адзін месяц з дня апублікавання аб'явы.**

**Адрас: 220007, г. Мінск, вул. Маскоўская, 15, аддзел кадраў, п. 215, тэл. 200-91-07.**

### НАВУКОВА-ДАСЛЕДЧАЯ УСТАНОВА «ІНСТЫТУТ ПРЫКЛАДНЫХ ФІЗІЧНЫХ ПРАБЛЕМ ІМЯ СЕЎЧАНКІ» БДУ

**аб'яўляе конкурс на замяшчэнне пасад:**

НАВУКОВАГА СУПРАЦОЎНІКА па спецыяльнасці (радыёфізіка);

НАВУКОВАГА СУПРАЦОЎНІКА па спецыяльнасці (сістэмны аналіз, кіраванне і апрацоўка інфармацыі).

**Тэрмін конкурсу – адзін месяц з дня апублікавання аб'явы.**

**Адрас: г. Мінск, вул. Курчатава, 7, тэл. 212-48-43.**

### ПЯРВІЧНАЯ ПРАФСАЮЗНАЯ АРГАНІЗАЦЫЯ СТУДЭНТАЎ БДУ

1 сакавіка ў 14.00 правядзе семінар «Размеркаванне выпускнікоў і працаўладкаванне маладых спецыялістаў», у рамках якога будуць арганізаваны кансультацыі. У ім прымуць удзел спецыялісты ЦК Беларускага прафесійнага саюза работнікаў адукацыі і навукі: намеснік старшыні Раман Дапіра і загадчык аддзела прававой абароны, галоўны інспектар працы Ларыса Манюк.

Месца правядзення семінара можна ўдакладніць на сайце прафкама www.profkom.bsu.by або па тэл. 206-62-33.

## КНІЖНАЯ ПАЛІЦА

# ВЫДАДЗЕНА Ў БДУ

**Па выніках мінулага года ў БДУ выдадзена 259 кніг і брашур агульным аб'ёмам 1866,93 улікова-выдавецкага аркуша. Падпісана да друку 227 арыгіналаў-макетаў аб'ёмам 1821,08 ул.-выд. арк. (165 – для выпуску ў друкарні, 62 – для размнажэння на ксераксах факультэтаў). На пачатку года не надрукаваны тыражы са 110-ці арыгіналаў-макетаў вучэбнай і навуковай літаратуры.**

**Грыф Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь атрымалі 15 вучэбных дапаможнікаў.**

*Калитин Б.С.* **Задачи по теоретической механике.** У дапаможніку змяшчаюцца задачы па спецыяльных раздзелах тэарэтычнай механікі: кінематыцы, дынаміцы, аналітычнай механіцы, праблеме двух цел, устойлівасці раўнавагі.

**Теоретическая механика: практикум.** У зборніку даюцца 18 заданняў комплекснага характару, якія аб'ядноўваюць асноўныя тэмы курса тэарэтычнай механікі. Кожнае з заданняў мае 40 варыянтаў.

*Норман Б.Ю.* **Болгарский язык в лингвострановедческом аспекте.** Дапаможнік разглядае такія тэмы, як ланд-



шафт і клімат Балгарыі, раслінны і жывёльны свет краіны, нацыянальная кухня, асаблівасці характару і звычаяў балгараў, маўленчы этыкет, прыёмы перакладу і г.д.

**Украінская літаратура. У 5 частках. Частка 2.** У хрэстаматыі знайшлі адлюстраванне ўсе значныя з'явы ўкраінскай літаратуры XIX ст., таксама даецца характарыстыка літаратурнага працэсу.

*Громыко А.О., Громыко О.В., Журавков М.А., Медведев Д.Г.* **Механика сплошной среды.** Криволинейные брусья, пластины и оболочки. У выданні даюцца асноўныя пытанні курса лекцый "Механіка суцэльнага асяроддзя" па раздзеле "Лінейная тэорыя пласцін і абалонак".

*Соболевский С.Л.* **Подвижные особые точки решений обыкновенных дифференциальных уравнений.** Манаграфія прысвячаецца Пенлеве-аналізу звычайных дыферэнцыяльных ураўненняў адвольнага парадку.

*Рубис А.С.* **Криминалистическое обеспечение деятельности прокурора в сфере борьбы с преступностью.** У манаграфіі



разглядаецца праблема аптымізацыі дзейнасці пракурора ў сферы барацьбы са злачынствам.

*Клецкова И.М.* **История русской философии.** Мэта навучальна-метадычнага комплексу — сфарміраваць у студэнтаў цэласнае бачанне логікі гісторыка-філасофскай рэканструкцыі асноўных праграм рускай філасофіі XIX—XX ст.

*Доўнар Т.І.* **Гісторыя дзяржавы і права Беларусі. У дзвюх частках. Частка 2.** У кнізе прыводзяцца схемы па найважнейшых і праблемных пытаннях курса гісторыі дзяржавы і права.

**Праграмы агульных курсаў. У трох частках. Частка 2.** Выданне змяшчае базавыя эксперыментальныя праграмы агульных курсаў, рэкамендаваных для студэнтаў БДУ, якія навучаюцца па спецыяльнасці "Гісторыя".

**Упраўленне рэдакцыйна-выдавецкай работы БДУ**

# Часопіс Science назваў пяць найбольш значных адкрыццяў мінулага года

*Першае месца* ў рэйтынгу заняў расійскі матэматык Рыгор Перэльман, які здолеў даказаць гіпотэзу Пуанкарэ.

Гэта матэматычная задача з вобласці тыпалогіі, чакала рашэння сто гадоў. Лепшыя матэматыкі біліся над ёй. Эксперты старанна вывучылі доказ і не знайшлі ў ім супярэчнасцяў, што і паслужыла падставай для прысуджэння Перэльману медаля Філдса – вышэйшай матыматычнай узнагароды, ад якой ён, праўда, адмовіўся.

*На другім месцы* ў "гарачай пяцёрцы" знаходзіцца даследаванне ДНК неандэртальца і маманта. Новыя дадзеныя пацвердзілі ранейшыя высновы: чалавек і неандэрталец разышліся ад свайго агульнага продка прыкладна 450 тыс. гадоў назад. Пакуль што ўдалося прачытаць асобныя фрагменты ДНК, вылучанай з узору косткі неандэртальца, якія ўключаюць у сябе каля мільёну нуклеатытаў, што складае толькі малую долю працэнта ад іх агульнай колькасці. Аднак эксперты лічаць расшыфроўку поўнага геному старажытнага чалавека справай бліжэйшай будучыні. Тыя ж метады прывялі да значнага прагрэсу ў расшыфроўцы геному маманта.

*Трэцяе месца* аддалі даследаванням, якія вызначылі пагражальную хуткасць раставання палярных ільдоў. Штогод леднікі Грэнландыі губляюць 100 гігатон ільду. Гэта прыводзіць да павольнага, але няўхільнага павышэння ўзроўню Сусветнага акіяну. Ацаніць маштаб дазволілі рэгулярныя назіранні за масай лядовага покрыва пры дапамозе штучных спадарожнікаў.

*На чацвёртым месцы* – знаходка дагістарычнай рыбы, якая, магчыма, з'яўляецца пераходнай формай паміж прабывальнікамі мора і сушы. Знойдзеную на поўначы Канады трохметровую істоту назвалі "тыктаалік", што азначае "вялікая прэснаводная рыба". Узрост знаходкі – 375 мільёнаў гадоў. Будова шкілета зблізкае старажытную рыбу з першымі чатырохногімі. Відаць, яна выкарыстоўвала пярэднія плаўнікі не толькі для плавання, але і для хадзьбы па дну. Хаця тыктаалік меў развітыя жабры, зусім верагодна, што ён мог дыхаць і атмасферным паветрам. Аднак пакуль няма падстаў лічыць старажытную канадскую рыбу продкам усіх чатырохногіх: не выключэнне, што гэта адно з тупіковых адгалінаванняў эвалюцыі.

*Пятае месца* дасталася вынаходніцтву пад умоўнай назвай "плашч-невідзімка". Маецца на ўвазе пакрыццё, якое робіць нябачным усё, што знаходзіцца пад ім. Праўда, эфект нябачнасці існуе толькі ў мікрахвалявым дыяпазоне і назіраецца з дапамогай спецыяльных пераўтваральнікаў электрамагнітных хваляў. Тэарэтычна даказана, што такія пакрыцці магчымы і для іншых хваляў, у тым ліку і ў аптычным дыяпазоне. Але наўрад ці трэба чакаць з'яўлення ў бліжэйшы час "плашча-невідзімкі", дзеянне якога можна будзе ўбачыць простым вокам.




***Рэдакцыя газеты прапануе ў гэты раз цікавую інфармацыю з галіны навукі і адукацыі. Такога кшталту матэрыял мы плануем размяшчаць раз-пораз на старонках нашага выдання. Пастаянна можна чытаць пра гэта ў інтранэце пад рубрыкай «Навіны краіны і свету».***

# Рэйтынг маскоўскіх вузаў-2007

**Рэйтынг маскоўскіх ВНУ складзены паводле апытання студэнтаў. Ацэнка ажыццяўлялася па пяцібальнай шкале.**

1. Расійская эканамічная школа (ацэнка – 4,53 бала).
2. Інстытут міжнароднага гандлю і права (4,46 бала).
3. Усерасійская акадэмія знешняга гандлю (4,34 бала).
4. Маскоўскі дзяржаўны інстытут міжнародных адносін (4,3 бала).
5. Дзяржаўны універсітэт – вышэйшая школа эканомікі (4,28 бала).
6. Акадэмія бюджэту і казначэйства Міністэрства фінансаў РФ (4,22 бала).
7. Інстытут псіхалогіі і педагогікі (4,2 бала).
8. Маскоўскі фізіка-тэхнічны інстытут (Дзяржаўны універсітэт) (4,18 бала).
9. Маскоўская міжнародная вышэйшая школа бізнесу "МИРБИС" (Інстытут) (4,18 бала).
10. Акадэмія права і кіравання (4,17 бала).
11. Акадэмічны прававы універсітэт пры Інстытуце дзяржавы і права Расійскай акадэміі навук (4,16 бала).
12. Маскоўскі гуманітарны універсітэт (былая Маскоўская гуманітарна-сацыяльная акадэмія) (4,14 бала).
13. Маскоўскі дзяржаўны універсітэт імя М.В. Ламаносава (4,11 бала).
14. Інстытут Міжнароднага права і эканомікі імя А.С. Грыбаедава (4,11 бала).
15. Міжнародны універсітэт (4,11 бала).
16. Маскоўскі адкрыты сацыяльны універсітэт (4,09 бала).
17. Маскоўскі дзяржаўны інжынерна-фізічны інстытут (тэхнічны універсітэт) (4,09 бала).
18. Фінансавая акадэмія пры Урадзе РФ (4,09 бала).
19. Маскоўскі інстытут МУС Расіі (4,08 бала).
20. Маскоўскі дзяржаўны універсітэт эканомікі, статыстыкі і інфарматыкі (4,08 бала).

**Па матэрыялах Point.Ru**

# Дваццатка папулярных навуковых міфаў: мана і праўда

**Калі вы ўсё яшчэ ўпэўнены, што жывёлы ўмеюць прадказваць надвор'е, што ежа, якая упала на падлогу, не паспее за 5 секунд пакрыцца бактэрыямі, і што мужчыны думаюць пра секс кожныя 7 секунд, то вам трэба пазнаёміцца з рэйтынгам 20-ці самых распаўсюджаных навуковых міфаў.**

**1. Курыца можа жыць без галавы.** Гэта сапраўды так. Клеткі мозга, якія кантралююць рэфлексы цела, часта застаюцца ў арганізме птушкі нават пасля "абезгалоўвання". Вядомы выпадак, калі курыца пражыла без галавы цэлых 18 месяцаў.

**2. У Паўднёвым паўшар'і вада ў вадавароце цячэ супраць гадзіннікавай стрэлкі з-за вярчэння Зямлі.** Няверна. Справа не толькі ў тым, што сіла вярчэння Зямлі надта малая для таго, каб паўплываць на кірунак вады ў вадавароце. Правядзіце самы просты тэст у некалькіх ракавінах і вы ўпэўніцеся, што кірунак вярчэння вады ў вадавароце залежыць ад формы і памеру ракавіны.

**3. У космасе няма гравітацыі.** У гэтай распаўсюджанай памылцы, хутчэй за ўсё, вінаваты тэрмін "нуль-гравітацыя". У сапраўднасці гравітацыя ёсць паўсюль, у тым ліку і ў космасе. Касманаўты здаюцца бязважкімі з-за таго, што яны знаходзяцца ў свабодным падзенні адносна Зямлі і пастаянна рухаюцца вакол яе. Паколькі размова зайшла пра космас, варта абвергнуць яшчэ адну памылковую думку наконт знаходжання вакууму ў космасе. Насамрэч у касмічнай прасторы прысутнічаюць атамы і малекулы, хоць яны і знаходзяцца на даволі вялікай адлегласці адзін ад аднаго.

**4. Людзі выкарыстоўваюць толькі 10 % рэсурсаў галаўнога мозга.** Гэтая вядомая памылковая думка трывала засела ў галавах жыхароў планеты дзякуючы СМІ. На самай справе магнітна-рэзанансная тамаграфія наглядна дэманструе, што людзі выкарыстоўваюць практычна ўвесь аб'ём кары галаўнога мозга.

**5. Паяданне булачак з макам раўназначна ўжыванню опіуму.** Гэтае анекдатычнае сцвярджэнне, надзіва, аказалася праўдзівым. Даследаванні паказваюць, што тэст на наяўнасць опіуму ў крыві можа быць станоўчым у чалавека, які з'еў усяго дзве булачкі.

**6. Манета, кінутая з хмарачоса, можа забіць прахожага.** Насамрэч манета, кінутая з велізарнай вышыні, наўрад ці нават падрапае чалавека, які праходзіць знізу.

**7. У дарослых людзей не ўтвараюцца новыя клеткі галаўнога мозга.** Яшчэ адзін памылковы погляд. Канешне, асноўная колькасць клетак галаўнога мозга ўтвараецца ў дзяцінстве, аднак гэта зусім не азначае, што развіццё на пэўным этапе спыняецца. Даследаванні паказваюць – нейроны працягваюць расці і змяняюцца на працягу ўсяго жыцця.

**8. Курыны булён лечыць ад прастуды.** "Лечыць" – моцна сказана. Аднак навукоўцы схіляюцца да думкі, што маці ва ўсім свеце робяць правільна, калі прымушаюць сваіх дзяцей піць курыны булён. Даследаванні сведчаць пра ўтрыманне ў ім супрацьзапаленчых рэчываў, якія дапамагаюць пазбавіцца ад катару.

**9. Пазяханне заразліва.** З гэтым сцвярджэннем цяжка спрачацца – магчыма, вы пачалі пазяхаць, як толькі прачыталі загаловак. Зрэшты, тлумачэнні тут маюць цалкам псіхалагічны характар: нават шымпанзэ перадражніваюць адзін аднаго.

**10. Маланка ніколі не трапляе ў адно і тое ж месца двойчы.** На самай справе маланка часта трапляе ў пэўныя месцы, асабліва размешчаныя на ўзвышшы: антэны, шпілі вышынных будынкаў і г.д.

**11. Сабачая зяпа чысцейшая за чалавечы рот.** Нягледзячы на звычку з'ядаць на вуліцы ўсё, што чалавек ніколі не возьме ў рот, сабачая зяпа чамусьці сапраўды лічыцца больш стырыльнай. У сапраўднасці бактэрыі, якія знаходзяцца ў поласці чалавечага рота і ў сабачай зяпе, настолькі розныя, што не могуць ісці ў параўнанне.

**12. Валасы і пазногці працягваюць расці нават пасля смерці.** Гэта думка не больш чым аптычная ілюзія. Пасля смерці чалавечае цела губляе шмат вадкасці, сцягваецца і стварае такі хваравіты і страшны эфект.

**13. Кошка, што падае, заўсёды прызямляецца на лапы.** Даследаванні паказалі, што кошкі, якія падалі з вялікай вышыні, сапраўды прызямляюцца на лапы. На жаль, кошкі, якія падалі з вышыні аднаго-двух метраў і ніжэй, такой здольнасцю не валодалі.

**14. Мужчыны думаюць пра інтым кожныя 7 секунд.** Чалавецтва, зразумела, думае аб працягненні свайго роду, але дагэтуль яшчэ не вынайшлі спосаб дакладна падлічыць, як часта мужчынам прыходзяць у галаву падобныя думкі. Зрэшты, калі судзіць па колькасці насельніцтва планеты, то, на шчасце, кожныя сем секунд – гэта перабольшванне.

**15. Верагоднасць прамокнуць пад дажджом змяншаецца, калі бегчы.** Банальныя матыматычныя разлікі пацвярджаюць праўдзівасць дадзенага міфа. Больш складаныя разлікі прымаюць да ўвагі таксама суаднесенасць колькасці дажджавых кропель, што не паспелі ўпасці за каўнер, і кропель, якія трапілі на бягучага чалавека з-пад ног.

**16 "Правіла пяці секунд".** Гэта правіла сцвярджае, што ежа, якая ўпала на падлогу і была паднятая за 5 секунд, не паспявае "заразіцца" шкоднымі бактэрыямі. На жаль, даследаванні (ды і банальная логіка) пацвярджаюць з'яўленне бактэрый на ежы адразу ж пасля кантакту з забруджанай паверхняй.

**17. Жывёлы здольныя прадказваць прыродныя катаклізмы.** Пакуль яшчэ не даказана, што ў жывёл ёсць шостае пачуццё, якое дапамагае ім прадказваць прыродныя катастрофы. Хутчэй за ўсё, іх абвостраны нюх і слых папярэджваюць пра насоўванне цунамі ці ўрагану.

**18. Змена кожнай пары года абумоўлена блізкасцю ці аддаленасцю Зямлі ад Сонца.** На самай справе адлегласць ад Зямлі да Сонца мінімальна ўплывае па тэмпературу зямной паверхні. Вугал нахілу Зямлі да Сонца – вось што ўздзейнічае на змену клімата.

**19. Вялікая Кітайская сцяна – адзіны створаны чалавекам аб'ект, які відаць з космасу.** Гэта сцвярджэнне нявернае. З калязямной арбіты касманаўты бачаць, напрыклад, егіпецкія піраміды і нават узлётна-пасадачныя палосы аэрапортаў. Але ж разглядзець Сцяну з Месяца яшчэ нікому не ўдавался.

**20. Чалавечаму арганізму патрэбна сем гадоў, каб пераварыць праглынутую жавальную гумку.** Канешне, для засваення жавальнай гумкі арганізму спатрэбіцца часу не намнога больш, чым, напрыклад, для арганічнай ежы. Аднак сем гадоў – гэта лічба, прыдуманая строгімі мамамі, каб дзеці не глыталі рознакаляровыя камячкі.

**Па матэрыялах Point.Ru**

УНІВЕРСІТЭТ
Выдаецца з 1929 года

Заснавальнік газеты – Беларускі дзяржаўны універсітэт
Газета ўзнагароджана Ганаровай граматай Вярхоўнага Савета БССР

Газета зарэгістравана Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.
Рэгістрацыйнае пасведчанне №149 ад 30 жніўня 2005 года

16 лютага 2007 года
Падпісана да друку 15.02.2007 г.
Зак. 95. Тыраж 1500 экз.Ум. друк. арк 2.
Надрукавана ў РУП "Выдавецкі цэнтр БДУ"
ЛП № 02330/0056850 ад 30.04.2004.
220030, г. Мінск, вул. Чырвонаармейская, 6

Рэдактар Сяргей ШАФАЛОВІЧ
Камп'ютарная вёрстка Аляксандра САЛАМАХІНА
Адрас рэдакцыі: 220030, Мінск, прасп. Незалежнасці, 4
Прыёмная рэдакцыі: вул. Бабруйская, 7,
пакой 411, тэлефон 209-53-45,
e-mail: gazeta@bsu.by; www.gazeta.bsu.by